ЧАМУ Ў КРАІНЕ ЗНІКАЕ ВУГОР? 8

ПРЫГОЖЫЯ, АЛЕ НЕБЯСПЕЧНЫЯ АГЕНЬЧЫКІ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 СНЕЖНЯ 2019 г. СЕРАДА № 240 (29107)

ЦЫТАТА ДНЯ

Эвеліна ШУЛЬЦ, кіраўнік аддзела палітыкі, эканомікі, прэсы і інфармацыі прадстаўніцтва ЕС у Беларусі:

«2020 год можа стаць знакавым з пункту гледжання імплементацыі пагадненняў паміж Беларуссю і Еўрасаюзам аб спрашчэнні візавага рэжыму і аб рэадмісіі. Але ўсё будзе залежаць у канчатковым выніку ад таго, калі будуць падпісаныя згаданыя дакументы. Калі ўсё атрымаецца (а я на гэта спадзяюся), то гэтыя дагаворы набудуць моц пасля падпісання, гэта значыць у 2020 годзе».

КАРАТКА

• Туман і тэмпература да 11 градусаў цяпла прагназуюцца ў Беларусі сёння, 18 снежня.

• Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у студзені—кастрычніку выраслі на 6,6 %.

• Тэхніка БелАЗ у студзені—лістападзе гэтага года пастаўлялася ў 47 краін свету.

• Біяметрычныя пашпарты ў Беларусі могуць увесці ў 2021 годзе.

• У Брэсцкай вобласці да 2025 года збіраюцца пабудаваць 263 новыя станцыі абезжалезвання.

• Пры добраўпарадкаванні тэрыторыі побач з Гальшанскім замкам знайшлі магільнік XIII—XIV стагоддзяў.

ISSN 1990 - 763X

БАЛЬ ПАЧЫНАЕЦЦА!

Фота БелТА.

Пад Новы год нават у такое бясснежнае слотнае надвор'е, як сёлета, хочацца чагосьці чароўнага і казачнага. Напрыклад, патанцаваць на балі. І гэта не завоблачная мара. Прынамсі, для найлепшых студэнтаў і навучэнцаў. Першыя сапраўдныя балі — з сукенкамі да падлогі, класічнымі танцамі — ужо прайшлі ў Магілёве і Віцебску. У Магілёў з усіх раёнаў вобласці з'ехаліся пераможцы і прызёры алімпіяд, выдатнікі вучобы і спорту. А ў Віцебску *(на фота)* у вальсе кружылі найлепшыя студэнты ВНУ і навучэнцы Віцебскага і Полацкага кадэцкіх вучылішчаў.

НАСТУПНАЯ СТАНЦЫЯ... «КАВАЛЬСКАЯ СЛАБАДА»

Да пуску першай чаргі трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна засталося 200 дзён

Журналісты «Звязды» правялі дзень з метрабудаўцамі і даведаліся, з чаго пачынаецца метро, колькі зорак на «Алесі» і якая станцыя самая глыбокая. СТАР. 5

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.



ВЯЛІКІ ВЫБУХ МАЛЕНЬКАГА КАТЛА

Як пазбегнуць надзвычайных сітуацый пры ацяпленні?

Позняя восень і пачатак зімы сёлета не вылучаюцца працяглымі перыядамі халадоў. Затое яны багатыя на пераход тэмпературы паветра праз нулявую адзнаку. І такія ваганні ртутнага слупка даволі рызыкоўныя для тых гаспадароў, якія абагравaюць свае прыватныя дамы не печкай, а пры дапамозе катла.

За апошнія тры месяцы адбыліся дзве надзвычайныя сітуацыі, звязаныя з эксплуатацыяй гэтых ацяпляльных агрэгатаў, якія маюць магутнасць менш за 100 кілават, — больш «моцныя» катлы выкарыстоўваюцца толькі ў прамысловым сектары. Распачаў статыстыку выбух у вёсцы Дудары Лідскага раёна. Гаспадар дома патэлефанаваў а 10-й раніцы 8 кастрычніка ратавальнікам і паведаміў, што ў яго доме разарвала ацяпляльны кацёл. Выбух прынёс істотны ўрон. Акрамя самога катла, была моцна пашкоджана перагародка паміж топачнай і ванным пакоем. СТАР. 3

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2020 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

СКЛАДАНЫЯ РАШЭННІ ДЛЯ ЭФЕКТЫЎНАЙ ЭКАНОМІКІ

Разам з экспартам галоўным фактарам росту нацыянальнай эканомікі з'яўляюцца інвестыцыі. Менавіта ім, а дакладней рэалізацыі найбольш праблемных інвестыцыйных праектаў, была прысвечана чарговая нарада ў Палацы Незалежнасці. Пытанні, на якія хацеў пачуць адказы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, гучалі наступным чынам: чаму ўкладанне значных сродкаў па асобных праектах аказалася малаэфектыўнае? Якія рашэнні прынятыя ўрадам для стабілізацыі работы прадпрыемстваў? Што зроблена ўрадам па запуску вытворчасцяў на новых прадпрыемствах? Што неабходна зрабіць для выключэння ў далейшым пралікаў? Адрасаваліся яны прадстаўнікам урада, старшыням абласным выканаўчых камітэтаў і, безумоўна, кіраўнікам гэтых прадпрыемстваў з новымі вытворчасцямі, якія таксама былі запрошаны на нараду. Прэзідэнт падрабязна разгледзеў і абмеркаваў з імі праблемныя пытанні кожнай з галін. Размова выдалася няпростая, пытанні абмяркоўваліся складаныя: дзе ўзяць грошы на заканчэнне праектаў і хто дасць гарантыі, што даўгі вернуць?

«З моманту здабыцця незалежнасці, як бы ні было цяжка, мы не закрылі, а падтрымалі і пастаянна развіваем прамысловую вытворчасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна Прэзідэнт спыніўся на тым, што ўжо зроблена: захаваны найбуйнейшыя ў сусветным маштабе прадпрыемствы машынабудавання, нафтаперапрацоўчай і хімічнай прамысловасці, значна мадэрнізаваны дрэваапрацоўчая, цэментная і харчовая галіны, створаны новыя высокатэхналагічныя магутнасці ў традыцыйнай энергасістэме. Пры гэтым актыўна развіваецца аднаўляльная і атамная энергетыка. Упершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі арганізавана вытворчасць лінейкі легкавых аўтамабіляў і рэалізуецца маштабны біятэхналагічны праект па вырабе амінакіслот.

Але галоўнае — нягледзячы на складанасць эканамічнай сітуацыі, штогод атрымлівалася захоўваць абгрунтаваны ўзровень інвестыцый у эканоміку.

«Пры гэтым галоўнае патрабаванне нязменнае — максімальная аддача ад кожнага ўкладзенага рубля. У выніку павінны быць забяспечаны эфектыўная занятасць і належны заробак. Мэта інвестыцый — стабільнае рэгіянальнае развіццё і павышэнне ўзроўню жыцця чалавека. Гэта значыць, укладаючы грошы ў эканоміку, мы арыентаваліся перш за ўсё на тое, каб з'яўляліся і развіваліся традыцыйныя прадпрыемствы, заснаваныя на перапрацоўцы сыравіны, якая ёсць у наяўнасці ў нашай краіне», — паведаміў кіраўнік краіны. Напрыклад, у дрэваапрацоўцы, цэментнай вытворчасці і шмат яшчэ якіх галінах трэба выходзіць на імпартазамяшчэнне.

Дасягнуць чаканых вынікаў атрымалася не паўсюль. Падпісаныя ў бізнес-планах паказчыкі не дасягнутыя, увод у прамысловую эксплуатацыю асобных новых вытворчасцяў, якія даўно павінны працаваць і прыносіць прыбытак, наогул спынены.

«Мной былі дадзены канкрэтныя даручэнні дэталёва разгледзець праблемныя пытанні як на месцах, так і ва ўрадзе, пад персанальную адказнасць службовых асоб выпрацаваць сістэмныя рашэнні, якія дазволяць прадпрыемствам эфектыўна развівацца. Тым не менш урад да канца года традыцыйна падрыхтаваў прапановы аб аказанні чарговай дзяржаўнай падтрымкі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Па яго словах, гэта падтрымка будзе рэалізавана пасля пераканаўчых доказаў, што ў ёй ёсць патрэба і не правалены план мадэрнізацыі і інвеставання, даведзены раней.

Акрамя пытанняў, звязаных з развіццём вытворчасці, кіраўнік дзяржавы пацікавіўся забеспячэннем аховы прыроды: «Гэта наша галоўнае багацце. Бясцэнная спадчына, якая належыць не толькі нам, але і дзецям, і якую абавязаны захаваць. А прэтэнзій у ведамстваў па ахове прыроды да інвестараў дастаткова».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што нарада вельмі важная, — на кон пастаўлены сотні мільёнаў долараў, якія ўкладзены ў вытворчасць. «Таму давайце без лішніх слоў, пакут, стогнаў, заклінанняў вызначацца, што будзем рабіць далей, асабліва з некаторымі асобнымі прадпрыемствамі, якія даўно павінны працаваць і прыносіць прыбытак», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

● У тэму

Прэм'ер-міністр Сяргей Румас расказаў, што ўрад працуе над завяршэннем асабліва значных для краіны інвестыцыйных праектаў. Зараз з 34 праектаў 22 уведзены ў эксплуатацыю (па 12 забяспечаны выхад на праектныя магутнасці). Па чатырох з іх, самых складаных, неабходна рашэнне кіраўніка краіны ў выглядзе падпісаных указаў.

«Прэзідэнт не падтрымаў гэтыя дакументы ў рабочым парадку, а адправіў іх на нараду, каб яшчэ раз пераканацца, што меры, якія просяць прадпрыемствы ў выглядзе дзяржпадтрымкі для заканчэння гэтых праектаў, пралічаныя і аптымальныя. Гэта тры праекты ў сферы цэлюлозна-папяровай прамысловасці — «Светлагорскі ЦКК», завод у Добрушы, завод у Шклове. І чацвёрты праект — гэта наша мінскае прадпрыемства «Камволь», новы праект па вытворчасці суконнай тканіны», — паведаміў Сяргей Румас.

На рэалізацыю гэтых праектаў прадпрыемствы і канцэрны запрасілі дадатковыя бюджэтныя грошы і перанос тэрмінаў вяртання раней выдадзеных сродкаў.

У завяршальнай стадыі знаходзіцца праект па будаўніцтве завода сульфатнай беленай цэлюлозы на базе прадпрыемства «Светлагорскі ЦКК». Па словах Сяргея Румаса, з 2018 года гэты праект заканчваецца «сваімі сіламі» без дапамогі інвестараў. Сярэдняя сутачная вытворчасць знаходзіцца на ўзроўні 80 % ад праектнага. З пачатку года выпрацавана 135 тысяч тон цэлюлозы, якая адпавядае ўсім міжнародным стандартам.

Абавязкі інвестараў па будаванні прадпрыемства ў Добрушы па вытворчасці мелаваных і немелаваных відаў кардону «пад ключ» не былі выкананыя. Аб'ект закансерваваны, захавана абсталяванне, праведзена інвентарызацыя. Урад выпрацаваў схему завяршэння праекта асобнымі пускавымі комплексамі і ўхваліў яе на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. «Для таго каб увесці гэты праект, трэба 83 мільёны еўра», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Трэці праект — вытворчасць паперы-асновы для дэкаратыўных абліцовачных матэрыялаў «Завод газетнай паперы» (Шклоў). Прадпрыемства ўведзена ў эксплуатацыю ў 2016 годзе, але на кантрактныя параметры не выйшла. Падрадчык не забяспечыў выпуск якаснага прадукту. Сёння лінія працуе кругласутачна, але стварае альтэрнатыўныя віды паперы. Для рэалізацыі магчымасцяў неабходна дапрацоўка пэўных вузлоў і агрэгатаў.

На площчах ААТ «Камволь» ствараюць вытворчасць суконнай тканіны. Разглядаліся розныя варыянты, але рэалізацыя праекта менавіта па пляцоўцы «Камволя», на думку ўрада, з'яўляецца найбольш аптымальнай. Рэнтабельнасць новай вытворчасці павысіцца за кошт эфектыўнага выкарыстання энергетычных рэсурсаў, актывізацыі кіруючага і дапаможнага персаналу. Сярод прычын непаспяховасці праекта — невыкананне замежнымі партнёрамі дагаворных абавязкаў па рэалізацыі прадукцыі. Цяпер «Камволь» самастойна выходзіць на сусветны рынак. Асноўная праблема прадпрыемства сёння — складанасці ў закупцы сыравіны і матэрыялаў ва ўмовах закрэдытаванасці.

Па астатніх 30 праектах рашэнне кіраўніка краіны не патрэбна — яны знаходзяцца ў кампетэнцыі ўрада і прадпрыемстваў.

Аб важнасці своечасовага ўвядзення ў строй гэтых праектаў і выхаду на праектную магутнасць гаворыць адна лічба. «Калі б гэтыя прадпрыемствы працавалі па раней зацверджаных бізнес-планах, то рост ВУП толькі па гэтай групе прадпрыемстваў быў бы на 0,3 % больш, чым мы маем сёння. Таму такія адносіны і ўвага кіраўніка краіны да гэтых 34 найважнейшых інвестыцыйных праектаў», — пазначыў прэм'ер-міністр.

* * *

Па выніках нарады па праблемных інвестыцыйных праектах Прэзідэнт даручыў стварыць міжведамасную рабочую групу з надзвычайнымі паўнамоцтвамі. Яна павінна пацвердзіць, што ўнесеныя ўрадам дакументы, тэрміны і сумы абгрунтаваныя і ў прадпрыемстваў вычарпаны ўсе магчымасці для самастойнай рэалізацыі незавершаных інвестпраектаў. Група на працягу двух тыдняў завершыць гэту работу, і ўказы выйдуць яшчэ ў 2019 годзе. У склад групы ўвойдуць прадстаўнікі Акадэміі навук, Белстата, Адміністрацыі Прэзідэнта, эканамісты з урада і дзяржаўных органаў.

Асноўныя патрабаванні да вытворцаў па выніках нарады (ды і як заўсёды) — тэхналогіі, аб'ёмы, прыбытак, рэнтабельнасць і, безумоўна, якасць. Перад тым як прасіць дзяржаўныя выдаткаванні, кіраўнік кожнага прадпрыемства павінен адказаць на пытанне: ці ўсё магчымае для вырашэння праблемы ўжо зроблена самастойна? І калі са станоўчым адказам пагодзіцца і рабочая група, праект можа разлічваць на інвеставанне.

Ва ўрадзе

МАТРЫЦА ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

У Беларусі распрацоўваюць асобны план дзеянняў па стварэнні ўмоў для развіцця эканомікі, паведаміў прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

Фота БелТА.

«У кастрычніку бягучага года кіраўнік дзяржавы падпісаў указ аб параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2020 год. У дакуменце вызначаны ключавыя паказчыкі эфектыўнасці работы ўрада і колькасныя арыенціры. Ад урада патрабуецца выбудаваць паквартальную матрыцу персаніфікаваных задач на 2020 год, якая мабілізуе ўсю вертыкаль улады на дасягненне канкрэтных вынікаў, а таксама — навацыя гэтага года — зацвердзіць план дзеянняў па стварэнні ўмоў для развіцця эканомікі на сярэднетэрміновы перыяд. Міністэрствам эканомікі распрацаваны адпаведны праект пастановы ўрада», — цытуе Сяргея Румаса БелТА.

Пры падрыхтоўцы дакумента перад распрацоўшчыкамі была пастаўлена задача аптымізаваць лічбы, якія даводзяцца, і максімальна іх кансалідаваць. Сяргей Румас звярнуў увагу, што пастановай будзе вызначана вычарпальнае іх кола. «Іншыя паказчыкі даводзіцца не павінны», — падкрэсліў ён. У цэлым пастанова не прадугледжвае змены канцэптуальных падыходаў па наборы ключавых паказчыкаў.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, традыцыйная эканоміка практычна вычарпала свае рэзервы росту, а далейшае развіццё магчыма толькі пры стварэнні новых вытворчасцяў, у тым ліку з прыцягненнем замежных інвестараў. У матрыцы гэтая задача вызначана толькі на рэгіянальным узроўні, таму Сяргей Румас прапанаваў таксама пазначыць такія задачы для галін і кіраўнікоў, якія адказваюць за іх развіццё.

Парламенцкі дзённік

РАЗАМ, АЛЕ НЕЗАЛЕЖНА

Казаць пра тое, што дзве дзяржавы ператворацца ў адну, — абсурдна

Такую думку выказала журналістам дэпутат Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расіі, член Камісіі Парламенцкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Вольга ГЕРМАНАВА перад пачаткам пасяджэння Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі.

«Пытанне інтэграцыі сёння вельмі балючае, магчыма, неадназначнае. Меркаванне, што краіны могуць аб'яднацца, — абсалютна абсурднае. Нашы дзяржавы незалежныя, але, каб было лягчэй узаемадзейнічаць, мусяць інтэгравацца заканадаўча ў эканамічнай, сацыяльнай сферах, а тым больш у маладзёжнай палітыцы», — сказала Вольга Германава.

Яна падкрэсліла, што краіны-суседкі вельмі блізкія гістарычна і па духу. Між тым Саюзнай дзяржаве ўжо дваццаць гадоў, а рашэнне аб стварэнні Маладзёжнай палаты прынята два гады таму.

«У старэйшага пакалення былі вельмі цесныя, непарыўныя сувязі з Беларуссю. Але пакаленне сыходзіць, і гэтыя сувязі пачынаюць слабець. Таму мы прыйшлі да высновы, што трэба больш працаваць з моладдзю, каб у нашых дзяржаў была інтэграцыя», — растлумачыла неабходнасць маладзёжнага фарміравання дэпутат.

На думку **старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, члена Камісіі Парламенцкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Людмілы МАКАРЫНАЙ-КІБАК**, фарміраванне Маладзёжнай палаты было правільным крокам, бо пайшло на карысць папулярызацыі сумеснай работы моладзі Беларусі і Расіі.

«Маладыя людзі вельмі актыўныя, яны навучыліся сябраваць паміж сабой, працаваць сумесна. У іх ёсць шмат ініцыятыў, з імі лёгка і цікава супрацоўнічаць», — адзначыла Людміла Макарына-Кібак.

Як прыклад сумеснай работы яна прывяла патрыятычны праект па лічбавізацыі помнікаў да 75-годдзя Перамогі «Лічбавая зорка», які стартуе ўжо ў пачатку новага года.

Варвара МАРОЗАВА.

ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

Камуналка, занятасць, гандаль, сельская гаспадарка, транспарт, ахова здароўя — гэтыя і іншыя тэмы сталі нагодай для размовы падчас суботняй прамой лініі з губернатарам Магілёўскай вобласці Леанідам ЗАЙЦАМ.

Усяго паступіла 23 пытанні ад жыхароў Магілёва, а таксама Магілёўскага, Чэрыкаўскага, Асіповіцкага, Шклоўскага, Глускага, Дрыбінскага, Круглянскага, Мсціслаўскага і Горацкага раёнаў. Напрыклад, аднаго магіляўчаніна турбавала будучыня жылых дамоў старой забудовы па вуліцы Мянжынскага, якія маюць патрэбу ў капітальным рамонце. Губернатар сказаў, што гэтая тэма патрабуе больш дэталёвага вывучэння, на падставе якога і будзе прынята рашэнне.

Фермера з Дрыбінскага раёна цікавіла, калі Магілёўскі і Бабруйскі хлебакамбінаты нарэшце разлічацца з ім за здадзенае збожжа. Камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама было даручана прыняць меры па паскарэнні разлікаў.

З Горак патэлефанаваў балельшчык магілёўскага футбольнага клуба «Дняпро», які панаракаў на гульню каманды і звярнуў увагу на тое, што наспела неабходнасць змянення яе трэнерскага складу. Ён таксама папрасіў аказаць падтрымку горацкаму футбольнаму клубу, які гуляе ў трэцяй лізе. Леанід Заяц адзначыў, што праводзіцца работа па ўдасканаленні трэнерскага складу магілёўскага клуба, і даў даручэнне вывучыць сітуацыю па горацкіх футбалістах і магчымасці аказання ім дапамогі.

Жанчына з Асіповіцкага раёна звярнула ўвагу на тое, што ў вёсцы Верайцы няма стацыянарнай крамы. Прыязджае аўталаўка, але людзей гэта не задавальняе. Акрамя таго, насельніцтва скардзіцца на якасць пітной вады, якая змяшчае шмат жалеза. Губернатар даручыў Асіповіцкаму райвыканкаму вырашыць пытанне па краме і разгледзець магчымасць будаўніцтва станцыі абезжалезвання ў наступным годзе.

Супрацоўнік ААТ «Цішоўка» з Магілёўскага раёна паскардзіўся на тое, што работнікі не атрымалі зімняе спецаддзенне для работы на вуліцы. Магілёўскаму райвыканкаму дадзена заданне выехаць на месца і вывучыць сітуацыю. Акрамя гэтага даручана пракантраляваць становішча са спецадзеннем па іншых гаспадарках вобласці.

Прагучала скарга ад забудоўшчыка жылога дома ў вёсцы Сенькава Магілёўскага раёна, які не можа падключыцца да электрасеткі. Энергетыкам сумесна са спецыялістамі Магілёўскага райвыканкама трэба будзе выехаць на месца і разабрацца з пытаннем.

На прамую лінію патэлефанаваў магіляўчанін, які выразіў падзяку магілёўскім уладам за тое, што горад за апошні час прыкметна пахарашэў. Ён таксама звярнуў увагу, што ў парку Падніколля не хапае аб'ектаў грамадскага харчавання. Мужчына лічыць, што вельмі дарэчы было б адкрыццё там рэстарана або кавярні з беларускай кухняй.

Яшчэ адна магіляўчанка абурылася станам тэрыторыі вакол аўтавакзала — агароджа занядбаная, а вакол кантэйнернай пляцоўкі, якая грамадзянамі выкарыстоўваецца не па прызначэнні, заўсёды прысутнічае непрыемны пах. Адпаведным службам горада, у тым ліку санітарнай, даручана навесці там парадак.

Сігнал аб дапамозе прагучаў з вёскі Гронаў Чэрыкаўскага раёна, дзе закрылі ФАП. Вёска, дарэчы, не маленькая, там пражывае 250 чалавек. Як высветлілася, будынак фельчарска-акушэрскага пункта знаходзіўся ў неналежным стане і пагражаў бяспецы людзей. Даручана разгледзець магчымасць рамонту будынка або прыняцця іншага кампраміснага рашэння. Галоўнае, каб людзям аказваліся якасныя медыцынскія паслугі, падкрэсліў губернатар.

Падводзячы вынікі прамой лініі, Леанід Заяц звярнуў увагу, што ўсе звароты грамадзян павінны знаходзіць практычнае вырашэнне.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ВЯЛІКІ ВЫБУХ МАЛЕНЬКАГА КАТЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У апошнім таксама выбіла шкло і часткова абрынуўся дах. Але гаспадару, можна сказаць, яшчэ пашанцавала. Выбуховая хваля не парушыла цэласнасць нясучых канструкцый, і таму дом для жылля прызнаны прыдатным. Меркаваная прычына здарэння — адсутнасць цыркуляцыі цепланосьбіта.

А ў канцы кастрычніка ў кацельнай вытворчай базы ў Жодзіне адбылася трагедыя. Пасля рамонту сеткавай помпы выбухнуў адзін з двух цвердапаліўных катлоў. У выніку загінуў чалавек, яшчэ чацвёра пацярпелі... Напрыканцы ж лістапада статыстыку інцыдэнтаў папоўніў выпадак у пасёлку Халопенічы Крупскага раёна. Тамтэйшая кацельная два гады таму была перааснашчана новымі ацяпляльнымі агрэгатамі. І вось неяк раніцай у топцы аднаго з іх падчас распальвання была знойдзена вада. У ацяпляльны сезон здарэнне, што і казаць, даволі непрыемнае — ад кацельнай залежыць тэмпература ў трох шматпавярховых дамах, бальніцы і школе-садку. Каб пасёлак не застаўся без цяпла, туды адправілі перасоўную кацельную. Прадстаўнікі завода-вытворцы аператыўна прыбылі ў Халопенічы і да вечара кацёл адрамантавалі, але... наступнай раніцай пацякла ўжо другая ўстаноўка. Цяпер Дзяржпрамнагляд праводзіць адпаведнае расследаванне.

Сітуацыю каментуе **начальнік упраўлення надгляду за бяспекай абсталявання, якое працуе пад ціскам, і цеплавых электрастанцый Дзяржпрамнагляду Уладзімір САФОНАЎ.**

— Калі ўначы тэмпература паветра змяншаецца ніжэй за нуль, то трубаправоды і пашыральныя бакі ацяпляльнай сістэмы замярзаюць. У контуры вада ўжо не цыркулюе, і недзе ўтвараецца ледзяны корак. Як правіла, датычыцца гэта памяшканняў кшталту гарышчаў, дзе бакі таксама недастаткова ўцеплены. Раніцай жа чалавек устае, пачынае тапіць кацёл, а на паказанні прыбораў не глядзіць. Ціск нарастае, і адбываецца выбух...

Яшчэ адна памылка — імкненне «прабіць» ледзяны корак павышаным ціскам пары. Рабіць гэтага нельга таму, што імгненна лёд не растане. А вось разарваць трубу ціск якраз здольны.

— У любым выпадку яшчэ да пачатку распальвання катла трэба адкрыць лінію падсілкоўвання сістэмы ацяплення і кантрольную лінію запаўнення пашыральнага бака, — працягвае Уладзімір Сафонаў. — Калі з яе вада не выходзіць або калі ціск на манометры расце па невядомай прычыне — значыць, справы дрэнныя, недзе трубу забіў лёд. Разаграваць яе можна, толькі паліваючы зверху праблемнае месца цёплай вадой, а пасля распальваць сістэму, кантралюючы ціск на манометры. Але бывае і так — здаецца, што вы як быццам растапілі лёд у адным месцы, зноў запусцілі кацёл, а ціск усё роўна пачынае набліжацца да максімальна дапушчальнага. Гэта значыць, што або недзе ўтварыўся яшчэ адзін корак, або не да канца ліквідаваны першы. У такім разе трэба спыніць падачу паліва ў топку, а яго рэшту заліць вадой.

Яшчэ адна прычына здарэнняў з ацяпляльнымі катламі — наяўнасць кандэнсату ў ніжняй «кішэні» коміна, яго абмярзанне і закаркоўка. Канешне, пасярод зімы праводзіць тэхнічныя работы — наўрад ці найлепшы варыянт. Але калі сезон халадоў скончыцца, то лепш ажыццявіць іх як мага раней, не адкладаючы на потым. А яны вельмі простыя — пачысціць паверхні ўнутры катла і комін ад сажы, правесці рэвізію арматуры, праверыць сістэму на герметычнасць і ўцяпліць усе яе часткі, што знаходзяцца ў памяшканнях, якія не ацяпляюцца.

Цікава, што газавыя катлы амаль ніколі не трапляюць у зводкі здарэнняў. Тут ёсць адзін адметны момант. Лічыцца, што газ пры яго няправільным выкарыстанні нясе большую рызыку. І гэта сапраўды так — газапаветраная сумесь можа разнесці ўшчэнт цэлы пад'езд шматпавярховіка, не кажучы ўжо аб невялікай сценачцы ў кацельнай. Таму газавыя катлы абавязкова абсталёўваюцца сістэмай аўтаматычнага выключэння, калі ў іх рабоце пачынаюцца перабоі. А вось цвердапаліўныя катлы, якія працуюць на дровах, торфабрыкетах і вугалі, маюць яе не заўжды.

Але гэта не азначае, што такое ацяпленне не патрабуе ніякай прафілактыкі. Незалежна ад таго, з якога матэрыялу зроблены дымавыя і вентыляцыйныя каналы, іх трэба чысціць і правяраць штогод. Для комінаў з цэглы гэты тэрмін яшчэ карацейшы — не менш чым раз на квартал.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота дадзена Дзяржпрамнаглядам.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Закон аб мігрантах выклікаў маштабныя пратэсты ў Індыі

Прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі заклікаў да спакою насельніцтва краіны, у якой ужо тыдзень працягваюцца пратэсты супраць новага закона аб наданні грамадзянства імігрантам-немусульманам. Масавыя дэманстрацыі праходзяць у найбуйнейшых індыйскіх гарадах — Дэлі, Мумбаі, Хайдарабадзе і Калькуце. Людзі выходзяць на вуліцы з розных прычын: адны сцвярджаюць, што ў новага закона антыісламская накіраванасць, іншыя асцерагаюцца маштабнай іміграцыі. У ходзе пратэстаў, якія пачаліся ў штаце Асам на паўночным усходзе краіны, загінула ўжо не менш за шэсць чалавек. «Ніводнаму жыхару Індыі не варта хвалявацца з нагоды новага закона, — напісаў у «Твітэры» Модзі. — Гэты закон прызначаны для тых, хто гадамі адчуваў ганенні за межамі краіны і каму проста няма куды падацца, акрамя Індыі». Вялікабрытанія, ЗША і Канада перасцераглі турыстаў ад наведвання паўночнага ўсходу Індыі, рэкамендуючы праяўляць вялікую асцярожнасць, калі такія паездкі ўсё ж неабходныя.

У Сіднеі забруджванне паветра ад пажараў у 11 разоў перавысіла небяспечны ўзровень

Маштабныя пажары ў Аўстраліі сталі прычынай пагрозлівага павышэння ўзроўню забруджвання паветра ў гэтай краіне, паведаміла аб'яднанне службаў аховы здароўя Climate and Health Alliance. Пры гэтым у дэпартаменце аховы здароўя Новага Паўднёвага Уэльса адзначылі рост колькасці людзей, якія звярталіся за мінулы тыдзень у бальніцы наконт праблем з дыханнем, — на 48 працэнтаў у параўнанні з сярэднімі паказчыкамі за мінулыя пяць гадоў. Зараз у гэтым аўстралійскім штаце зафіксавана больш за сотню ачагоў узгаранняў, у тым ліку буйны пажар на поўнач ад Сіднея, які ахапіў больш за 400 тысяч гектараў тэрыторыі. Раней ад вогненнай стыхіі ў Аўстраліі загінула сама меней шэсць чалавек. Таксама было знішчана больш за 700 будынкаў, выгарала не менш за тры мільёны гектараў. Улады абмяжуюць спажыванне вады для больш чым 35 тысяч чалавек на поўдні штата Квінсленд нормай 80 літраў у дзень, паведамляюць СМІ. Па афіцыйных звестках, 2019-ы можа стаць адным з самых гарачых гадоў за ўвесь час назіранняў у Аўстраліі.

Ідалы вострава Вялікадня дазвалялі павялічваць ураджайнасць

Старажытныя рапануйцы — карэнныя жыхары вострава Вялікадня ў Ціхім акіяне — высякалі каменныя статуі мааі, бо верылі, што тыя ідалы дапамагаюць прыносіць большы ўраджай. Каманда амерыканскіх археолагаў сцвярджае, што знайшла навуковыя доказы гэтага. Такую выснову навукоўцы зрабілі, вывучыўшы хімічны састаў базальтавай пароды, з якой высечаныя статуі. Было праведзена сур'ёзнае даследаванне двух ідалаў з каменяломні, размешчанай на схіле вулкана Рана Рараку ў заходняй частцы Рапа-Нуі. Менавіта адтуль родам большасць усіх маналітных статуй, хоць сам вулкан займае менш за працэнт плошчы вострава. «Калі мы атрымалі вынікі хімічнага аналізу, я не паверыла сваім вачам, — згадвае геаархеолаг і глебазнаўца Сара Шэрвуд. — Там была вельмі высокая канцэнтрацыя элементаў, якіх я ў прынцыпе не чакала ўбачыць, — накшталт кальцыю або фосфару. Менавіта яны з'яўляюцца ключавымі для паспяховага вырошчвання раслін і проста неабходныя для атрымання высокага ўраджаю».

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Гомельлен», г. Гомель, ул. Советская, 126
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет торгов:
Административный корпус общей площадью 163,7 кв. м, инвентарный номер 311/С-32766, расположенный по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, гп Тереховка, пр-д Луговой, 1. **Сведения о земельном участке:** участок общей площадью **0,1790 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания административного здания.
Начальная цена с НДС 20 % бел. руб. (снижена на 80 %) — 2 255,24 белорусского рубля

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи	**15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов было опубликовано **24.10.2019 в газете «Звязда»**

Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов 10.00 30.12.2019 г. Окончание торгов 11.00 30.12.2019 г. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.12.2019 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by

Беларусь і свет

МЫ — У ПАЎСОТНІ НАЙМАЦНЕЙШЫХ

Днямі была агучана справаздача ПРААН аб чалавечым развіцці — 2019 па тэме «За рамкамі даходаў, за рамкамі сярэдніх паказчыкаў, за рамкамі сённяшняга дня».

Гэты даклад падрыхтавала ў Мінску **пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Аляксандра САЛАЎЁВА.** У прыватнасці, яна адзначыла, што наша краіна ў глабальным рэйтынгу чалавечага развіцця паднялася на тры пазіцыі і дзеліць цяпер 50-е месца з Казахстанам сярод 189 дзяржаў планеты. Перад ёй размясцілася Расія, далей — некаторыя ўсходнееўрапейскія краіны рэгіёна. Гэты факт азначае, што Беларусь уваходзіць у групу краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця, прычым робіць гэта другі год запар.

Сталі жыць больш і багацей

Спадарыня Салаўёва патлумачыла, што індэкс чалавечага развіцця (ІЧР) грунтуецца на адкрытых статыстычных звестках па трох асноўных індыкатарах: чаканая працягласць жыцця, узровень адукаванасці насельніцтва і колькасць гадоў, выдаткаваных на навучанне, а таксама ўзровень жыцця, ацэнены праз валавы нацыянальны даход на душу насельніцтва. Але з улікам тэматыкі справаздачы гэтага года — няроўнасць і спосабы яе пераадолення — ІЧР скарэкціраваны. «Калі мы пераацэньваем ІЧР з улікам няроўнасці, то бачым, што Беларусь траціць 6 % свайго паказчыка, у той час як для краін з самым вельмі высокім індэксам гэтая лічба складае больш за 10 %. Гэта сведчыць аб станоўчай сітуацыі з роўнасцю ў Беларусі», — дадала прадстаўнік ПРААН.

У цэлым развіццё чалавечага патэнцыялу ў нашай краіне характарызуецца паступальным ростам. За перыяд з 1995 да 2018 года паказчык Беларусі ў рэйтынгу індэкса чалавечага развіцця вырас з 0,656 да 0,817, або на 24,5 %. За гэты час сярэдняя працягласць жыцця ў краіне павялічылася на 3,9 года (цяпер яна складае 74,6 года), а сярэдняя працягласць навучання — на 3,8 года. Валавы нацыянальны даход на душу насельніцтва павялічыўся за гэтыя гады на 103,8 %.

Вучацца больш, а атрымліваюць менш

У нашай краіне гендарнае пытанне амаль вырашана. Ва ўсякім выпадку, мы маем пазітыўныя паказчыкі. «Індэкс чалавечага развіцця жанчын вышэйшы, чым у краінах Усходняй Еўропы і Азіі. Цікава, што ў адрозненне ад большасці дзяржаў ён нават вышэйшы за індэкс развіцця мужчын», — заўважыла Аляксандра Салаўёва. Жанчыны ў Беларусі жывуць на 10 гадоў больш, чым мужчыны. Сярэдняя працягласць жыцця першых у 2018 годзе была 79,4 года, у апошніх гэты паказчык роўны ўсяго 69,2 года.

Адзначаецца высокі ўзровень адукацыі жанчын, для якіх у сярэднім працягласць навучання дасягае 15,7 года. А ў мужчын гэты паказчык толькі 12,3 года.

Таксама ў нашай краіне рэкордна нізкі паказчык мацярынскай смяротнасці: у 2018 годзе ён складаў чатыры жанчыны на 100 тысяч парадзіх, а паводле звестак 2019 года — дзве жанчыны на 100 тысяч. «Але гендарная няроўнасць захоўваецца ў эканоміцы. Узровень удзелу жанчын у эканоміцы больш чым на 10 % ніжэйшы, чым мужчын. І гэта тая вобласць, дзе патрабуюцца дадатковыя намаганні», — звярнула ўвагу пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі. Варта дадаць, што па звестках Белстата, розніца ў даходах мужчын і жанчын не перавышае 25 %.

Інвестыцыі ў навуку пакуль не вялікія

Тое, што ў нас штогод павялічваецца лясны фонд, назіраецца скарачэнне дэградаваных зямель і невысокае выкарыстанне запасаў прэснай вады, — усё гэта пазітыўныя моманты экалагічнай устойлівасці. А яна ў сучасных рэаліях аказвае вялікі ўплыў на ІЧР і няроўнасць паміж краінамі з розным яго ўзроўнем. Тут мы выйграем.

Але на долю аднаўляльных крыніц энергіі ў нас пакуль прыпадае 6,8 %. «Праўда, працягваецца ўкараненне энергаэфектыўных тэхналогій. І ПРААН вітае гэта», — падкрэсліла Аляксандра Салаўёва. Да пазітыўных рысаў яна таксама аднесла наяўнасць высокакваліфікаванай рабочай сілы, імкненне да дыверсіфікацыі эканомікі, развіцця высокатэхналагічнага сектара і значную навукова-даследчую базу.

Але для раскрыцця інавацыйнага патэнцыялу патрэбныя дадатковыя інвестыцыі ў гэтай галіне. У цяперашні час выдаткі на падтрымку навуковых даследаванняў невялікія. Таму трэба будзе сумесная работа ўсіх партнёраў як у дзяржаўным, так і ў прыватным сектары, міжнародных інстытутаў, каб распрацоўваць нацыянальныя стратэгіі ўстойлівага развіцця.

А як у суседзяў?

Змяненне клімату і тэхналагічныя ўзрушэнні могуць стаць прычынай далейшага ўскладнення перспектыў развіцця рэгіёна, ствараючы напружанне на рынках працы і ў сістэме сацыяльнай абароны, гаворыцца ў дакладзе ПРААН, які датычыцца Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі.

Скарачэнне сярэдняга класа, высокі ўзровень нефармальнай і нестабільнай занятасці, прабелы ў сацыяльнай абароне, эміграцыя кваліфікаваных і маладых работнікаў, а таксама ўспрыманне няроўнасці перад законам робяць праблемы няроўнасці асабліва актуальнымі ў гэтым рэгіёне.

Па меры скарачэння разрыву ў базавым узроўні жыцця ўзнікаюць новыя формы няроўнасці, выкліканыя нераўнамерным доступам да тэхналогій і адукацыі.

Так, амаль 90 працэнтаў энергіі ўсходнееўрапейскі рэгіён атрымлівае за кошт выкапнёвага паліва, і амаль 30 працэнтаў зямель класіфікаваны як дэградаваныя. І хоць рэгіён займае сярэдняе месца па сусветным паказчыку выдаткаў на даследаванні і распрацоўкі, суадносіны занятасці высокакваліфікаваных і нізкакваліфікаваных работнікаў тут складаюць усяго палову ад гэтых суадносін у багатых краінах — разрыў, пераадолець які можа рабіцца ўсё цяжэй па меры імклівага развіцця тэхналогій у больш «прасунутых» рэгіёнах.

У свеце неспакойна

Нягледзячы на прагрэс у барацьбе з галечай, голадам і хваробамі, у свеце ўзмацняецца няроўнасць, пра што сведчаць шматлікія акцыі пратэсту, якія адбываюцца ў многіх краінах свету.

Аўтары даклада адзначаюць, што разрыў у базавым узроўні жыцця мільёнаў скарачаецца, гэта значыць, усё больш людзей маюць магчымасць набыць тавары першай неабходнасці. Але людзі выходзяць на вуліцы па розных прычынах: гэта могуць быць кошт білета на цягнік, цэны на бензін, патрабаванні палітычных свабод, імкненне да справядлівасці і правасуддзя.

Аднак узнікаюць новыя формы няроўнасці — яны выяўляюцца ў сферы адукацыі і доступу да тэхналогій. На дабрабыт людзей таксама ўплывае змяненне клімату. На думку экспертаў ПРААН, калі не прыняць меры, то бездань, што падзяляе розныя слаі насельніцтва і краіны, пашырыцца да маштабаў, якіх свет не бачыў з часоў прамысловай рэвалюцыі.

Тое, што раней лічылася «дадатковым плюсам», напрыклад вучоба ва ўніверсітэце або шырокапалосны інтэрнэт, набывае ўсё большую важнасць, а людзі, якія не маюць гэтых магчымасцяў, пазбаўленыя неабходнага «трамплiна», каб атрымаць поспех у будучыні, пераканаць Пэдра Консейсаў, прадстаўнік ПРААН і адзін з аўтараў даклада.

Так, у краінах з вельмі высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу колькасць людзей, якія маюць магчымасць карыстацца стацыянарным шырокапалосным інтэрнэтам, расце ў 15 разоў хутчэй, чым у краінах з нізкім узроўнем.

Распрацоўшчыкі даклада адзначаюць, што ў краінах з найбольшай прадукцыйнасцю працы, як правіла, даходы размяркоўваюцца больш раўнамерна. Гэта забяспечваецца за кошт падтрымкі прафсаюзаў, забеспячэння мінімальнай заработнай платы, мер сацыяльнай абароны, а таксама шырэйшай прадстаўленасці жанчын на рынку працы. У дакладзе таксама адзначаецца роля падаткаабкладання, якое, як адзначаюць яго аўтары, мае прамую сувязь з выдзяленнем дзяржаўных сродкаў на ахову здароўя, адукацыю і развіццё «зялёнай» эканомікі.

Сяргей КУРКАЧ.

Беларусь палепшыла сваю пазіцыю ў сусветным рэйтынгу наймагутнейшых краін

Беларусь трапіла на 35-е месца ў рэйтынгу самых «магутных краін свету», па версіі амерыканскага часопіса U.S. News. Наша краіна палепшыла сваю пазіцыю ў параўнанні з мінулым годам. На 34-м месцы знаходзіцца Новая Зеландыя, на 37-м — Люксембург, Украіна — 39-я, Польшча — 44-я, Літва — 76-я. «Найбольш магутныя краіны свету пастаянна дамінуюць у навінавых загалоўках, маюць вялікі ўплыў на палітычнай арэне і адыгрываюць ключавую ролю ў фарміраванні глабальных эканамічных мадэляў», — адзначае usnews.com.

Пры складанні рэйтынгу ўлічваліся даныя аб аб'ёме валавога ўнутранага прадукту, колькасці насельніцтва, а таксама паказчык ВУП на душу насельніцтва. На першым месцы апынуліся ЗША, на другім — Расія, на трэцім — Кітай. У топ-10 таксама ўвайшлі Германія, Вялікабрытанія, Францыя, Японія, Ізраіль, Саудаўская Аравія, Паўднёвая Карэя. Усяго ў рэйтынгу 80 краін. На апошнім месцы — Эстонія.

НОВЫ ГОД ПАЧАЦЬ З АЗДАРАЎЛЕННЯ

Фота БелТА.

Больш за шэсць тысяч замежных турыстаў сустрэнуць навагоднія святы ў беларускіх санаторыях. Пераважная большасць з іх (80 %) — расіяне. Пуцёўкі ў беларускія здраўніцы на Новы год былі раскуплены яшчэ тры месяцы таму, а ў самыя папулярныя — нават раней. У прыватнасці, у «Юнацтва» — амаль за год, у пачатку лютага 2019-га прадалі апошнія.

Беларускія санаторыі па-ранейшаму цікавыя і для замежнікаў

— На навагоднія святы на беларускія санаторыі павышаны попыт. За некалькі месяцаў усе пуцёўкі былі забраніраваны і цяпер на 100 % выкуплены, — дзеліцца **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.** — Цэны на навагоднія туры нязначна павялічаны ў сувязі з павышаным попытам. Калі сярэдні кошт адных сутак у стандартным двухмесным пакоі сёлета каштаваў 57 рублёў 60 капеек, то на святы — 64 рублі. Сярэдні кошт святочнага банкета — 135 рублёў. Пуцёўкі рэалізаваны ў поўным аб'ёме, і санаторыі будуць працаваць у гэтыя дні з поўнай загрузкай.

Дарэчы, самымі папулярнымі ў расіян і іншых замежных турыстаў з'яўляюцца санаторыі «Ружанскі» (Брэсцкая вобласць), «Азёрны», «Радон» і «Альфа-Радон» (Гродзенская вобласць), «Баравое», «Лясное» (Віцебская вобласць), на возеры Нарач — «Прыазёрны» і «Спадарожнік», «Юнацтва», «Крыніца» (Мінская вобласць), «Світанак» (Магілёўская вобласць), «Прыдняпроўскі» і «Сосны» (Гомельская вобласць). Сёлета ў Беларусі ў санаторыях адпачыла 230 тысяч замежных грамадзян.

Больш за 220 мільёнаў рублёў заробяць за 2019 год санаторыі ад экспарту паслуг (193 мільёны летась). Больш чым на 10 % вырасце выручка ад дадатковых паслуг. Пры гэтым, як падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі, пералік абавязковых медыцынскіх і аздараўленчых працэдур, якія ўваходзяць у кошт пуцёўкі, пашыраны. Адпаведны дакумент падпісаны ў IV квартале гэтага года:

— Дадатковыя паслугі ніхто не навязвае, імі можна не карыстацца, калі госцю дастаткова тых, што ўключае пуцёўка. Іх менш не становіцца, наадварот, мы пашырылі пералік.

Калі на навагоднія святы больш за палову адпачывальнікаў у беларускіх санаторыях — замежныя грамадзяне, то ў іншы час большую частку пуцёвак (60 %), якая паступае ў свабодную рэалізацыю, выкупляюць беларусы. Сёлета ў беларускіх здраўніцах адпачыла і аздаравілася 1,36 мільёна чалавек, у тым ліку за кошт рэспубліканскага бюджэту і сродкаў сацыяльнага страхавання — 790 тысяч. З іх каля 720 тысяч — дзеці (80 % вылучаных сродкаў расходуецца менавіта на іх пуцёўкі ў лагеры і іншыя аздараўленчыя ўстановы), астатнія 70 тысяч — дарослыя.

Ці дастаткова гэтых пуцёвак, каб задаволіць усіх ахвотных? Генадзь Балбатоўскі ўпэўнены, што так:

— Пасля рэфармавання нашага цэнтра ў 2006—2007 гадах перад намі стаяла задача зрабіць пуцёўкі даступнымі як для працуючых, так і для непрацуючых грамадзян. Да гэтага чарга чакання магла складаць да 10 гадоў. Сёння інваліды I і II груп забяспечваюцца пуцёўкамі ў санаторый раз у два гады. Людзі з больш лёгкімі паталогіямі — раз у тры-чатыры гады. На гэтыя мэты штогод мы закупляем 25 тысяч пуцёвак для непрацуючых грамадзян. Столькі ж для працуючых. Магу сказаць, што мы задавальняем патрэбу ўсіх камісій па аздараўленні. Той, хто працуе, звярнуўшыся ў гэту камісію, на працягу года атрымае пуцёўку ў санаторый у адпаведнасці са сваімі паказаннямі на аздараўленне.

Інваліды I і II груп атрымліваюць пуцёўкі бясплатна, астатнія катэгорыі грамадзян — у залежнасці ад сваіх даходаў. У сярэднім пенсіянеры аплачваюць 20—30 % кошту пуцёўкі, працуючыя грамадзяне — 30—40 %.

На наступны 2020 год рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва правёў працэдуру закупкі пуцёвак. На гэтыя мэты з бюджэту было выдаткавана 225 мільёнаў рублёў (сёлета 200 мільёнаў). У прыватнасці, налета на 1,5 тысячы павялічыцца колькасць пуцёвак для непрацуючых грамадзян.

Алена КРАВЕЦ.

НАСТУПНАЯ СТАНЦЫЯ... «КАВАЛЬСКАЯ СЛАБАДА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Штотыдзень кіраўнікі УП «Мінскметрабуд» на чале з генеральным дырэктарам Леанідам Стухальскім аглядаюць аб'екты будаўніцтва. Здаецца, зусім нядаўна па гістарычных мерках, у чэрвені 1977, была забіта першая паля Мінскага метрапалітэна, а сёння ўжо ў сталіцы працуе 29 станцый, якія штодня перавозяць каля мільёна пасажыраў...

Трэцяя лінія метро працягнецца на 17,2 кіламетра і будзе налічваць 14 станцый. Пакуль што яны ў розных ступенях гатоўнасці: адны чакаюць фінішнай аздобы, іншыя яшчэ існуюць толькі на чарцяжах.

На аб'ектах першай чаргі трэцяй лініі работа ідзе кругласутачна — занятая большасць з 2150 чалавек. Дарэчы, як адзначае падчас паездкі **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Алег БАЙЧУК**, у такім вялікім калектыве ёсць і дынастыі. Для сем'яў Шалаевых, Жураўлёвых метро стала сямейнай справай. Гэта і не дзіўна: у «Мінскметрабудзе» імкнуцца стварыць добрыя ўмовы для работнікаў, нават гарачым харчаваннем на будпляцоўках забяспечваюць з часткавай аплатай арганізацыяй.

На прадпрыемстве працуюць прадстаўнікі больш як 60 спецыяльнасцяў: бетоншчыкі, зваршчыкі, муляры, плітачнікі, кіроўцы... Інжынерна-тэхнічны склад рыхтуе ў асноўным БНТУ, спецыялістаў хапае.

«Рамантыка? Канешне, ёсць. Калі дзеці кажуць: «Вось гэту станцыю будаваў мой тата!», будаўнікі адчуваюць — гэта на стагоддзі», — адзначае Алег Байчук.

Здаецца, метро — мужчынская справа. Але і дзяўчаты-інжынеры ёсць. Ды працуюць так, што моцнай палове толькі і застаецца, што слухацца.

СУЗОР'Е «АЛЕСІ»

І вось мы на краі катлавана. Гэта будучая станцыя «Немаршанскі сад». Але гэта ў стане зразумець толькі спецыялісты — для журналістаў, якія з метро маюць справу толькі ў якасці пасажыраў, тут проста пляцоўка. І без гумавых ботаў сюды лепш не лезці.

«Насамрэч будаўніцтва метро пачынаецца з падрыхтоўкі тэрыторыі — рассялення жыхароў і зносу будынкаў, уладкавання інжынерных сетак, будаўніцтва аб'ездаў», — тлумачыць **галоўны інжынер Аркадзь АРУЦЮНЯН.**

Сёння дабудоўваюцца ўсе станцыі першай чаргі. Чатыры пабудаваныя тунэлі прынеслі чатыры зоркі на борт тунэлепраходчага механізаванага комплексу «Алеся». Купілі комплекс французскай вытворчасці ў 2015 годзе. А называць вялікія комплексы жаночымі імёнамі — міжнародная практыка ў метрабудаванні. «Наша «Алеся» грызе ўсё — нават велізарныя валуны», — ганарацца метрабудаўцы.

І расказваюць, як ТПМК з хірургічнай дакладнасцю прайшоў 1240 метраў — адхіленне ў тунэлі не можа скласці больш за пяць сантыметраў.

Такой ювелірнай работай метрабудаўцы абавязаны **дырэктару геадэзічна-маркшэйдарскага ўпраўлення Міхаілу ДЗЯДЗЮШКІНУ** і яго падначаленым. Такая служба высокадакладнай геадэзіі — адзіная ў краіне. А выконваюць увесь комплекс работ ад

першай палі да здачы аб'екта ўсяго трыццаць лінейных работнікаў.

«Самае складанае на любой лініі — здаць першую частку, бо тут перасадачныя вузлы. А на гэтай лініі іх два. Потым ужо развіваць лінію прасцей», — тлумачыць Міхаіл Дзядзюшкін, які метро аддаў 37 гадоў.

Ён добра памятае час, калі метро было практычна хэнд-мэйдам: ручны шчыт, кірка, адбойны малаток, рыдлёўка, ваганетка. І чалавек, якому скараюцца нетры. Між іншым, тунэлі даўжынёй да 400 метраў і сёння праходзяць такім жа чынам, бо параметры «Алесі», як сапраўднай прыгажуні, раўняюцца 90... метраў у даўжыню. І 550 тон вагі.

Зараз ТПМК разабраны і па частках перавозіцца на будучую «Аэрадромную». Пасля зборкі комплекс пачне пракладаць тунэль у бок «Слуцкага гасцінца».



РЭЙКІ, РЭЙКІ... ШПАЛАЎ НЯМА

Наведалі «Аэрадромную» і мы. І ўбачылі, як абсталёўваецца катлаван. Тут ужо зразумела, што гэта будучае метро, — вось толькі крыху хвалюешся за шматпавярховікі, да якіх, здаецца, рукой падаць. А хутка ж пачнецца праходка тунэляў, адначасова будзе пашырацца катлаван і абсталёўвацца станцыя...

— Ніводзін фундамент не пацерпіць, — супакойваюць спецыялісты. І тлумачаць: беларускія метрабудаўцы першымі яшчэ ў Савецкім Саюзе распрацавалі ўнікальную тэхналогію «сцяна ў глебе», якая дазваляе будаваць катлаван ва ўмовах шчыльнай жылой забудовы. Атрымліваецца як па класіцы — ціха і без пылу.

Але гэта далёка не апошняя інавацыя. На новай лініі рэйкі, вядома, застануцца — а вось шпалаў ужо не будзе. Метрабудаўцы распрацавалі вібраізаляцыйны блок БВ-2 (летась, дарэчы, прызнаны найлепшым будаўнічым прадуктам года). Тое, што раней даводзілася закупляць, сёння вырабляецца на ўласным заводзе. А дзякуючы стандартнай шырыні каляі ў мінскім метро будуць перавозіць пасажыраў цягнікі «Штадлер», якія збіраюцца ў Фаніпалі.

Падчас будаўніцтва першай чаргі нідзе не давялося замарожваць глебу (як пад Нямігай пры будаўніцтве першых ліній). Урэшце, пасля 2023 года пры будаўніцтве трэцяй чаргі трэцяй лініі зноў давядзецца працаваць пад ракой.

ДЗВЕРЫ ЗАЧЫНЯЮЦЦА

Сёння да здачы амаль цалкам гатовая «Кавальская Слабада» (будаўнікі паміж сабой кажуць «Жукоўская»). Яна, між іншым, адзіная будуецца адкрытым спосабам. А на «Вакзальнай» увогуле засталіся апрацоўчыя і пусканаладачныя работы. На ёй і скончыўся наш абход.

Нават дзіўна, што яшчэ ў 2014 годзе тут быў стары пасёлак. Сёння ўжо відаць канцэпцыю афармлення станцыі — гранітная падлога, шкляная і ячэістая чорная столь, зялёныя сцены з керамаграніту і эмаліту (эмаліраванае шкло). Дызайн станцый распрацоўваюць калегі метрабудаўцаў з «Метрапраекта».

«У асноўным «Вакзальная» мяркуецца ў чорных тонах, па ёй будуць свяціцца каляровыя палосы накшталт чыгуначных шляхоў і ў раёне эскалатараў сыходзіцца. Упрыгожыць станцыю сімвалічнае «дрэва шляхоў», — расказвае **намеснік галоўнага інжынера Тунэльнага атрада № 1 Андрэй СЕРАФІМОВІЧ.**

Эскалатары, травалатары і пешаходныя тунэлі дазволяць пасажырам спускацца на першую лінію такім чынам, каб пасажырапатокі не перасякаліся. Пакуль што літаральна за сценкай, на «Плошчы Леніна», імчаць цягнікі і ходзяць пасажыры: метрабудаўнікі не разбураюць апошнюю перагародку, каб не падвяргаць небяспецы пасажыраў і не ствараць перашкод калегам з Мінскага метрапалітэна.

...Лічбы зваротнага адліку да ўводу трэцяй лініі мяняюцца штодня і адлюстроўваюцца на маніторы ў адміністрацыйным будынку «Мінскметрабуда», а супрацоўнікі з гонарам падлічваюць, праз колькі дзён перарэжацца чырвоная стужка. Ну а сённяшнюю працу метрабудаўцаў ацэняць і ўнукі нашых чытачоў, бо гарантыя на станцыі даецца на стагоддзе.

Варвара МАРОЗАВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і Мінскметрабуда.

Факты мінскага метро

- «Юбілейная» будзе самай глыбокай станцыяй Мінскага метрапалітэна — да трыццаці метраў.
- Цяпер дзве дзейныя лініі перавозяць каля мільёна пасажыраў у суткі.
- З 25 сакавіка да 1 красавіка рух цягнікоў па другой лініі Мінскага метрапалітэна ад «Фрунзенскай» да «Каменнай Горкі» будзе спынены: запланавана ўрэзка стрэлкі паміж другой і трэцяй лініямі.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

Лот 1: Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (12 % готовности) и земельный участок г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-811 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), кадастровый номер 423650100000300143 5, площадь 0,1000 га (частная собственность)
Начальная цена продажи – 15 749,89 р. (пятнадцать тысяч семьсот сорок девять рублей восемьдесят девять копеек), в том числе: земельного участка в сумме 10 630 р. и не завершенного строительством жилого дома в сумме 5 119,89 р. Сумма задатка – 1 575 р. (одна тысяча пятьсот семьдесят пять рублей)
Намеснік міністра адзначыў, што наша краіна разглядае магчымасць ратыфікацыі трох апошніх пратаколаў да Канвенцыі: Аб барацьбе з падкісленнем, эўтрафікацыяй і прыземным азонам (Гётэборгскага пратакола); Па стойкіх арганічных забруджвальніках; Па цяжкіх металах. Цяпер у рамках рэалізацыі праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі, накіраванага на ўдасканаленне сістэмы кіравання якасцю паветра і фінансуемага Еўрапейскім саюзам, праводзіцца ацэнка наступстваў далучэння Беларусі да пратаколаў па цяжкіх металах і стойкіх арганічных забруджвальніках. Работы плануецца завяршыць у 2020 годзе.

Вераніка КОЛАСАВА.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

Што хаваецца за яркімі агеньчыкамі?

Чаму падчас навагодніх свят лепш адмовіцца ад піратэхнікі

У дзяцінстве мы з сяброўкамі вельмі чакалі свят — тады ў парку рабілі дыскатэку і запускалі феерверкі. Спачатку яркія агеньчыкі выклікалі захапленне, бо бачыла я іх вельмі рэдка. Але потым салюты сталі запускаць усе, каму толькі хочацца, і захапленне змянілася непрыязнасцю і нават страхам — бачыць і чуць, як нешта грукоча пад вокнамі, мякка кажучы, не вельмі прыемна. Мы часта чуем, якія жудасныя траўмы людзі атрымліваюць ад піратэхнікі, але пра тое, як яна шкодзіць навакольлю і жывёлам, гаворыцца мала. Давайце гэта абмяркуем і падумаем, ці сапраўды вартая хвілінная забаўка такіх ахвяр.

Адзін выбух — дзясяткі шкодных рэчываў

Наўрад ці вы задумваліся, што яркія колеры феерверку, якія выклікаюць столькі станоўчых эмоцый, атрымліваюцца дзякуючы таксічным рэчывам. Напрыклад, алюміній надае салюту брыльянтава-белы колер, але ў той жа час выклікае дэрматыты і накопліваецца ў арганізме, парушае работу нервовай сістэмы. Нітрат барыю «адказвае» за зялёны колер, а заадно моцна раздражняе дыхальныя шляхі. Злучэнні медзі — гэта блакітная афарбоўка, аднак разам з тым яны правакуюць анкалагічныя захворванні.

Важна!

Большасць феерверкаў вылучае яшчэ і такія высокатаксічныя рэчывы, як сера, мыш'як, марганец, перхлараты калію, нітрат стронцыю.

Дарэчы

У Берліне падчас святкавання Новага 2019 года была запушчана самая вялікая ў Германіі колькасць феерверкаў, эколагі выявілі 853 мікраграмы часцінак дробнага пылу на кубічны метр паветра — гэта амаль у 40 разоў вышэй за норму!

Акрамя дзясятка цяжкіх металаў пасля феерверкаў, петардаў ці бенгальскіх агнёў у навакольным асяроддзі яшчэ аказваюцца дробныя часцінкі пылу (дробнадысперсны пыл) і акісляльнікі. Так, перхлараты — хімічныя злучэнні, якія спрыяюць акісленню выбуховых рэчываў, — парушаюць работу шчытападобнай залозы. А часцінкі пылу наносяць шкоду дыхальнай і сардэчна-сасудзістай сістэмам. Падчас свят канцэнтрацыя гэтых рэчываў у буйных гарадах перавышае норму не менш чым у дзесяць разоў!

Пасля выбуху піратэхнікі вылучаецца вуглякіслы газ. Напрыклад, у ЗША пасля Дня Незалежнасці яго колькасць у атмасферы склала 50 тысяч тон, што можна прыраўняць да выкідаў гэтага газу падчас лясных пажараў больш чым на 1000 гектарах зямлі.

Пакутуюць і чалавек, і жывёлы

На Новы год, Раство, дзень нараджэння ці проста калі ў чалавека добры настрой, і ён вырашыў парадаваць сябе яркім феерверкам, жывёлы, у тым ліку і хатнія, не ведаюць, куды падзецца. Мае сабакі, напрыклад, хаваюцца ў ванны пакой ці залазяць пад ложак. Яны амаль нічога не ядуць і прыслухоўваюцца да кожнага шораху. Але хатнія гадаванцы жывуць дома, і ім ёсць куды падзецца. А на вуліцы шмат бяздомных жывёл, якія могуць не паспець уцячы. Часта пасля свят валанцёры знаходзяць катоў і сабак з сур'ёзнымі траўмамі і апёкамі.

Цікава!

Эколагі некаторых краін выступаюць за поўную забарону піратэхнікі. Сярод іх, напрыклад, у Фінляндыі і Германіі.

Думаю, вы таксама здагадаліся, што ўсе шкодныя рэчывы, якія выдзяляе піратэхніка, трапляюць у вадаёмы, наносяць шкоду рыбам, птушкам і іншым жывёлам.

Што ж датычыцца людзей, то толькі ў Мінску ў ноч на 1 студзеня 2019 года ад выбухаў піратэхнікі пацярпелі 27 чалавек. І гэта толькі з бачнымі пашкоджаннямі, бо шкоду ад таксічных рэчываў адразу выявіць цяжка.

Дык няўжо такая забаўка таго вартая? Вырашаць, вядома, толькі вам.

Маша ЗЯЛЁНАЯ.

«ЗЯЛЁНАЯ» БУДУЧЫНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ТУТ!

Статус «зялёных школ» атрымалі 40 установ адукацыі з розных куткоў краіны

Больш за 150 удзельнікаў з усёй Беларусі сабраліся днямі на форум сеткі «зялёных школ» у Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства, каб пабачыцца з аднадумцамі, падзяліцца цікавымі ідэямі і адзначыць найлепшых школьнікаў і педагогаў у галіне аховы прыроды.

Форум быў арганізаваны сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам экалогіі і краязнаўства ў рамках праекта «Уцягванне грамадскасці ў экалагічны маніторынг і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні» («Экаманіторынг»), які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у Беларусі ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Падчас мерапрыемства 40 устаноў адукацыі атрымалі дыпломы I, II і III ступеняў аб прысуджэнні ім статусу «зялёная школа». Узнагароды атрымалі вучні і педагогі — пераможцы рэспубліканскага конкурсу экалагічных праектаў «Зялёная школа», які праходзіў у 2018/2019 навучальным годзе. Усяго на конкурс было прадстаўлена больш за 600 работ у розных намінацыях.

Экалагічны рух «Зялёныя школы» развіваецца ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Беларусі. Распрацаваць і ўкараніць аднайменны адукацыйны праект у нашай краіне стала магчымым дзякуючы сумесным намаганням Еўрапейскага саюза, ПРААН, Мінпрыроды і Міністэрства адукацыі.

Атрымаць статус «зялёнай школы» можа кожная ўстанова адукацыі, школьнае лясніцтва, цэнтр пазашкольнай работы, экалагічны цэнтр для дзяцей і юнацтва. Галоўная ўмова — выканаць комплекс заданняў па такіх кірунках, як біяразнастайнасць, энерга- і водазберажэнне, абыходжанне з адходамі, інфармацыйна-экалагічныя мерапрыемствы, а з бягучага года — і якасць атмасфернага паветра.

— Мы доўга ішлі да таго, каб уручыць сёння першыя дыпломы «зялёных школ», — сказала падчас форуму **кіраўнік праекта «Экаманіторынг» Вольга ЧАБРОЎСКАЯ.** — Дапамагаць развіваць гэту сетку — адно з мерапрыемстваў нашага міжнароднага праекта. Але самая вялікая работа ў гэтым кірунку вядзецца Рэспубліканскім цэнтрам экалогіі і краязнаўства (РЦЭіК), які з'яўляецца галоўным рэсурсным цэнтрам па праграме «Зялёныя школы».

Дырэктар Цэнтра Алена АНУФРОВІЧ адзначыла, што дыплом «зялёнай школы» — гэта заслуга не асобных педагогаў, а ўсяго калектыву, каманды ўстановы, якая разумее важнасць устойлівага развіцця і ідзе ў гэтым працэсе папярадзе іншых.

Падчас форуму адбылося таксама адкрыццё навукова-эксперыментальных лабараторый па маніторынгу атмасфернага паветра і вывучэнні экалагічных тэхналогій, створаных на базе РЦЭіК у рамках праекта «Экаманіторынг». Працавалі секцыі і навукова-практычныя пляцоўкі для педагагічных работнікаў, прайшлі лабараторныя практыкумы для навучэнцаў.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.
Фота ПРААН.

Чытайце ў снежаньскім нумары часопіса «Родная прырода»:

— Навошта пашыраць «арганіку» на прылаўках?

— Як студэнткі спрабуюць зрабіць мінскія офісы экадружалюбнымі.

— Калі штучная ёлка замяніла жывую.

— Новы цуд свету — вадаспад Ігуасу.

— «Засушыў чарніку — і ў кампот можна», або Дзікарослыя расліны ў сістэме харчавання беларусаў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

Организатор электронных торгов (продавец): Михановичский сельский исполнительный комитет, Минский область, Минский район. аг. Михановичи, пер. Садовый, 8, тел.: (017) 545 10 25, 503 71 67, 545 10 23, 510 62 13, тел. моб. 8 (029) 165 98 22, 8 (029) 559 28 62.
Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
Торги проводятся 31 января 2020 г. на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

№ лота	Местонахождение земельного участка; кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура*	Начальная цена лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб.
1	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-6; **№ 623684206601000368**	0,1380	В населенном пункте имеются сети электроснабжения, газоснабжения и связи. Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях, подъезд к участку осуществляется с улицы местного значения	18 575,00	1857,50	1893,57 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
2	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-7; **№ 623684206601000370**	0,1392		18 736,00	1873,60	1746,62 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
3	Минская обл., Минский р-н. Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 12; **№ 623684204101000225**	0,1245	Имеется возможность подключения к сетям электроснабжения, подъезд к участку осуществляется с улицы местного значения. В настоящее время ведется проектирование и строительство газопровода за счет собственных средств граждан (кооператив по газификации). Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных	7 777,17	777,72	2132,76 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
4	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Березина, земельный участок № 4; **№ 623684200601000074**	0,1500	Имеется возможность подключения к сетям электроснабжения, подъезд к участку осуществляется с улицы местного значения. В настоящее время ведется проектирование и строительство газопровода за счет собственных средств граждан (кооператив по газификации). Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях	14 000,00	1400,00	1103,99 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
5	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Березина, земельный участок № 3; **№ 62368420060100073**	0,1500		14 000,00	1400,00	1143,60 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
6	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Березина, участок № 1; **№ 623684200601000071**	0,1500		14 000,00	1400,00	1162,60 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
7	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Кайково, объект № 42-2015/Мих; **№ 623684202601000303**	0,1202	Свет, газ, вода, подъезд к участку имеется	15 000,00	1500,00	1739,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
8	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Серафимово, ул. Восточная; **№ 623684206101000231**	0,1405	Свет, газ, вода, подъезд к участку имеется	20 000,00	2000,00	325,30 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
9	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Серафимово, **№ 623684206101000268**	0,1186	Свет, газ, вода, подъезд к участку имеется	19 000,00	1900,00	76,50 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
10	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Дубовый Лес, **№ 623684202101000108**	0,1353	Свет, газ, вода, подъезд к участку имеется	8 000,00	800	76,50 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
11	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 5-2017/М **№ 623684200101000221**	0,1364	Свет, газ, подъезд к участку имеется	22 916,00	2292	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
12	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 21-2017/М **№ 623684200101000220**	0,1379	Свет, газ, подъезд к участку имеется	23 168,00	2317	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
13	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 22-2017/М **№ 623684200101000219**	0,1179	Свет, газ, подъезд к участку имеется	19 808,00	1980	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
14	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 27-2017/М **№ 623684200101000218**	0,1380	Свет, газ, подъезд к участку имеется	23 184,00	2318	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
15	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 7-2017/М **№ 623684200101000212**	0,1449	Свет, газ, подъезд к участку имеется	24 344,00	2434	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
16	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 26-2017/М **№ 623684200101000213**	0,1227	Свет, газ, подъезд к участку имеется	20 614,00	2061	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
17	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 6-2017/М **№ 623684200101000214**	0,1423	Свет, газ, подъезд к участку имеется	23 906,00	2391	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
18	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 25-2017/М **№ 623684200101000215**	0,1285	Свет, газ, подъезд к участку имеется	21 588,00	2159	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
19	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 23-2017/М **№ 623684200101000216**	0,1405	Свет, газ, подъезд к участку имеется	23 604,00	2360	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП
20	Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 28-2017/М **№ 623684200101000217**	0,1289	Свет, газ, подъезд к участку имеется	21 656,00	2166	1732,15 + расходы на размещение информации СМИ и на ЭТП

* в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями. Возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам осуществляется на основании решения Минского районного исполнительного комитета от 22 октября 2018 г. № 5195.

Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – 27 января 2020 г. до 15.00.

Задаток для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах, рег. № ___ по заявлению № ___.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

белагропромбанк
www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.10.2019	01.01.2019
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		184 904	165 473
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		192	195
4	Средства в Национальном банке	1103		602 116	699 963
5	Средства в банках	1104		403 232	497 464
6	Ценные бумаги	1105		3 010 780	3 172 743
7	Кредиты клиентам	1106		5 374 215	5 090 638
8	Производные финансовые активы	1107		6	350
9	Инвестиции в зависимые юридические лица	11071		-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица	11072		-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		41 299	41 259
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		421 642	416 286
13	Доходные вложения в материальные активы	1110		328	6 791
14	Имущество, предназначенное для продажи	1111		8 620	12 720
15	Отложенные налоговые активы	1112		-	1
16	Деловая репутация	11121		-	-
17	Прочие активы	1113		165 803	180 978
18	**ИТОГО активы**	**11**		**10 213 137**	**10 284 861**
19	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
20	Средства Национального банка	1201		-	-
21	Средства банков	1202		1 539 251	1 507 830
22	Средства клиентов	1203		5 811 746	5 974 007
23	Ценные бумаги банка	1204		929 073	935 270
24	Производные финансовые обязательства	1205		159	15
25	Отложенные налоговые обязательства	1206		180	4
26	Прочие обязательства	1207		90 813	88 306
27	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**8 371 222**	**8 505 432**
28	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
29	Уставный фонд	1211		1 238 350	1 238 350
30	Эмиссионный доход	1212		-	-
31	Резервный фонд	1213		33 110	22 945
32	Фонды переоценки статей баланса	1214		165 646	154 777
33	Накопленная прибыль	1215		397 639	356 141
34	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации	12151		1 834 745	1 772 213
35	Доля неконтролирующих акционеров	12152		7 170	7 216
36	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**		**1 841 915**	**1 779 429**
37	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**10 213 137**	**10 284 861**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь – сентябрь 2019 года

(в тысячах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.10.2019	01.10.2018
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		509 898	500 980
2	Процентные расходы	2012		258 558	248 683
3	Чистые процентные доходы	201		251 340	252 297
4	Комиссионные доходы	2021		151 057	126 436
5	Комиссионные расходы	2022		46 096	34 276
6	Чистые комиссионные доходы	202		104 961	92 160
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		104	29
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		259	3 399
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		14 261	23 328
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		1 554	437
11	Чистые отчисления в резервы	207		103 776	82 961
12	Прочие доходы	208		79 067	80 076
13	Операционные расходы	209		278 529	252 527
14	Прочие расходы	210		17 754	21 715
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		51 487	94 523
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		1	1 242
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		51 486	93 281
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц	30		-	-
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц	31		-	-
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	3		51 486	93 281
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации	32		51 418	93 171
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)	33		68	110
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
24	Базовая прибыль на простую акцию	22		-	-
25	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

И. о. Председателя Правления П. Е. Василевский

Главный бухгалтер М. А. Шаповалова

Дата подписания: 28 ноября 2019 г.

Отчетность опубликована на странице сайта: https://www.belapb.by/cms/images/KBO%2029112019.pdf

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Будзьце пільныя!

ГАЛАЛЁД СТАВІЦЬ ПАДНОЖКУ

Зімой, асабліва ў галалёд, пільную ўвагу трэба праяўляць пажылым людзям, якія імкнуцца весці актыўны лад жыцця — наступствы падзенняў у такім узросце нашмат горшыя, чым у больш маладых. Таксама трэба быць пільнымі бацькам. Найперш з-за небяспекі траўміравання дзяцей падчас катання на «ватрушках». Не меншую небяспеку тояць і батутныя цэнтры. Пра гэта расказалі спецыялісты.

— Траўміраванне мае сезонны характар: калі летам яно часта звязана з сельскагаспадарчай дзейнасцю, то з надыходам халадоў мы сутыкаемся з вялікай колькасцю галалёдных траўмаў, — кажа **ўрач-траўматолаг-артапед прыёмнага аддзялення РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Андрэй ЯРАШЭВІЧ.** — Але на першым месцы сярод прычын — неасцярожныя паводзіны самога чалавека.

Медык звярнуў увагу на правільную ацэнку ўмоў надвор'я пажылымі людзьмі.

— У экстранных умовах надвор'я не варта ісці ў паліклініку па рэцэпт, які вам, магчыма, сёння і не патрэбны. Падзенні ў галалёд заўсёды для сталых людзей заканчваюцца сумна. Калі малады чалавек упаў, падняўся і пайшоў далей, то ў пажылога гэта пералом. І трэба ўсведамляць, што ў сталым узросце пералом можа мець зусім іншыя наступствы, чым у маладым.

Андрэй Ярашэвіч таксама падкрэсліў, што цяпер вялікую колькасць траўмаў атрымліваюць дзеці ў батутных цэнтрах.

— Многія дзеці спартыўна не падрыхтаваныя і не гатовыя да такіх нагрузак. Пры гэтым яны скачуць, атрымліваюць няправільную нагрузку — у выніку ўзнікае кампрэсійны пералом пазваночніка. Цяпер мы маем вялікую колькасць такіх зваротаў.

Таксама медыкі нагадалі пра хуткі надыход сезона катання на «ватрушках». І тут бацькам параілі не адпускаць дзяцей катацца адных, кантраляваць спуск з горкі цалкам і ні на хвіліну не пакідаць дзіця без увагі.

За апошнія пяць гадоў колькасць траўмаў у краіне хоць нязначна, але расце. Больш за 99 % з іх не звязана з вытворчасцю. Як расказаў **намеснік дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Аляксандр ЛІНАЎ,** 77 % — гэта бытавыя траўмы, 15 % — вулічныя, 1 % — транспартныя, 0,6 % — спартыўныя. Каля 66 % траўміраваных — людзі працаздольнага ўзросту.

— На працягу апошніх 12 гадоў траўма як прычына смерці займае 4-е месца пасля хвароб сістэмы кровазвароту, новаўтварэнняў, хвароб нервовай сістэмы. Пры гэтым за апошнія пяць гадоў смяротнасць ад знешніх прычын (да якіх і адносяцца траўмы і выпадковыя атручэнні) знізілася больш чым на 12 %, — расказаў Аляксандр Лінаў.

Сёлета колькасць памерлых ад усіх знешніх прычын зменшылася на 7 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Прычым гэта характэрна для ўсіх рэгіёнаў, за выключэннем Віцебскай вобласці. Там адбыўся рост — за кошт колькасці загінулых ад атручэння алкаголем, механічнага ўдушэння і ўтаплення.

У структуры смяротнасці ад знешніх прычын лідзіруюць наўмыснае самапашкоджанне, уключаючы самагубствы (21,8 %), выпадковыя атручэнні алкаголем (19,3 %), выпадковыя падзенні (амаль 14 %), дарожна-транспартнае траўміраванне (8,7 %).

Рызыкі для псіхікі

ТОЛЬКІ БЕЗ ПАНІКІ!

Па статыстыцы, кожны пяты жыхар планеты хоць раз адчуваў прыкметы гэтай псіхічнай хваробы. Яна можа ўзнікнуць як у падлеткаў, так і ў дарослых людзей. Наколькі гэта сур'ёзна? Ці можна прадбачыць з'яўленне сімптомаў у сябе або блізкіх? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў намеснік дырэктара па медыцынскай частцы РНПЦ «Псіхічнае здароўе» Сяргей ОСІПЧЫК.

— Чым характарызуюцца панічныя атакі?

— Галоўныя сімптомы — гэта беспадстаўныя прыступы трывогі і страху. Могуць рэзка з'явіцца галавакружэнне, патлівасць, пачуццё дэперсаналізацыі (неаб'ектыўнасць самаўспрымання асобы), дэрэалізацыі (парушэнне ўспрымання навакольнага свету), слабасць у целе, адчуванне нібыта кашлю, камяка ў горле, ціск у грудной клетцы. Таксама характэрнымі сімптомамі ў перыяд прыступаў з'яўляюцца страх смерці, страх страціць прытомнасць, розум або кантроль над сабой. Як правіла, прыступ доўжыцца ад некалькіх хвілін да некалькіх гадзін і суправаджаецца моцным выкідам адрэналіну і кароткачасовым уздымам артэрыяльнага ціску. Гэтыя станы бескантрольныя. Напрыклад, можна ляжаць сабе пад сонцам на адпачынку, слухаць музыку, а ў наступную хвіліну адчуваць нешта негатыўнае.

— Якія прычыны расстройства? Чаму адны схільныя да яго, а іншых гэта абыходзіць бокам?

— Узнікненне панічных атак не звязана ні з узроўнем адукацыі, ні з кліматам, у якім знаходзіцца чалавек, ні з узростам. Прыступы могуць з'явіцца без асаблівай прычыны. У кагосьці яны пачынаюцца пасля няшчасцяў — страты блізкага, разводу. Часам гэта можа быць звязана з ужываннем алкаголю ці наркотыкаў. Раздражняльнікам служыць і стрэс. Высокі тэмп жыцця, недахоп асабістага часу і прасторы, пастаяннае напружанне — усё гэта падставы для з'яўлення псіхічнай хваробы. Дарэчы, ярка яна праяўляецца ў вялікіх гарадах.

— Мужчыны ці жанчыны больш схільныя да пападання ў зону рызыкі?

— Прыкладна ў роўнай ступені. Іншая справа, што жанчыны больш адкрытыя на эмоцыі, прагаворванні пачуццяў. Мужчыны ж трымаюць многае ў сабе, а пасля гэта праяўляецца ў выглядзе псіхасаматычных захворванняў, афектыўных расстройстваў (змяненне эмацыяльнага стану ў бок прыгнечання або, наадварот, уздыму). Чаму па статыстыцы мужчыны жывуць менш, чым жанчыны? Стрыманыя ў сабе прадстаўнікі моцнага полу, як ні дзіўна, па сваёй прыродзе вельмі адчувальныя да стрэсаў.

— Да якога ўрача трэба звяртацца?

— Напачатку да тэрапеўта. Таму што падобныя сімптомы могуць быць і пры захворваннях сэрца або гіпертырэёзе (гіперфункцыі шчытападобнай залозы) — трэба адразу выключыць гэтыя варыянты. Спецыяліст прызначыць патрэбныя абследаванні, і калі са здароўем усё добра, але адчуванне фізічнай болі працягваецца, — гэта падстава наведаць псіхіятра або псіхатэрапеўта.

— Ці ёсць альтэрнатыўныя спосабы справіцца з прыступамі?

— Дапамагае нагрузка — прысяданні, адцісканні, прабежка, а таксама перыядычны адпачынак. Хтосьці ў такія моманты імкнецца «перабіць» іх хатняй працай, серыялам. Ідзе на карысць і дыханне ў пакет: яно добра ўплывае на ўзровень вуглекіслага газу ў крыві, тармозіць перанапружанне дыхальнага цэнтра — гэта расслабляе дыяфрагму. Можна таксама выкарыстоўваць методыкі брушнога або фарсіраванага (больш энергічнага) дыхання — калі па чарзе ўдыхаць і выдыхаць па дзесяць разоў. А вось ад кавы і алкаголю лепш адмовіцца, яны пагаршаюць сітуацыю.

— Панічныя атакі — расстройства апошніх дзесяцігоддзяў?

— Не зусім, яно існавала і раней, але пра гэта не гаварылі ўслых. Ёсць цікавы феномен: у перыяды масавага стрэсу, напрыклад, падчас вайны ці голаду, людзі адчувалі нашмат менш неўратычных расстройстваў, чым цяпер. Калі асноўная мэта чалавека — перамагчы ворага ці выжыць, ён асабліва не задумваецца над асабістымі перажываннямі. Цяпер жа людзі больш сканцэнтраваныя на сабе, сваіх пачуццях і ўчынках, асабліва моладзь. Ёсць жаданне дзяліцца штодзённасцю ў сацсетках, транслявать свае праблемы на вялікую аўдыторыю. Гэта ўплывае як станоўча, так і адмоўна. З аднаго боку, з'яўляецца камунікацыя, што добра, але, з іншага, лепш распавесці пра хваробу родным, сябрам або ўрачу. Бо ёсць асабліва ўражлівыя асобы, якія ўсё ўспрымаюць на свой рахунак, а пасля баяцца хваробы, якой увогуле можа і не быць.

— Што будзе, калі не лячыць гэтую хваробу?

— Якасць жыцця можа знізіцца. Часта прыступы ўзнікаюць у пэўных месцах і абставінах: у кагосьці ў транспарце, у некага — у закрытых памяшканнях або, наадварот, у шматлюдных месцах. У выніку атрымліваецца, што расстройства абмяжоўвае. Да таго ж нярэдка людзей мучыць чаканне новага прыступу, і само гэта чаканне ўжо выклікае трывогу.

— Як пазбавіцца ад панічных атак назаўсёды?

— Часам хапае навучання тэхнікам рэлаксацыі, чаргавання працы і адпачынку ў сукупнасці з добра падабраным лячэннем. Але бываюць больш цяжкія выпадкі, калі прыступы з'яўляюцца зноў і зноў на працягу доўгіх гадоў. У хворага міжвольна ўзнікаюць думкі, якія яго пужаюць, ён спрабуе пазбавіцца ад праблемы з дапамогай дакучлівых дзеянняў накшталт штодзённага шматлікага мыцця рук (кампульсіўнае расстройства). У такім выпадку патрабуецца больш часу на выздараўленне, але праблема вырашальная. Варта памятаць, што калі вы сутыкнуліся з непадкантрольнай панікай, галоўнае — не даць ёй узмацніцца. Трывогу выклікаюць не нейкія аб'ектыўныя фактары, а проста часовы стан арганізма. Пры ўсёй бачнай яркасці праяў гэтая хвароба не нясе небяспекі для жыцця.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота аўтара.

Пытанне-адказ

Калі павышаны дыясталічны ціск...

Што рабіць, калі павышана ніжняя лічба ціску (дыясталічны ціск), пры гэтым верхняя лічба ў норме? Ці трэба прымаць прэпараты для зніжэння ціску? Напрыклад, мой ціск 110 на 90.

Кацярына Леанідаўна, *Аршанскі раён.*

Адказвае загадчык аддзялення Фрунзенскага раённага кардыялагічнага цэнтра (на базе 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска) Наталля КАРПУК.

— У цыклічным функцыянаванні сэрца ёсць дзве фазы: сістала, або скарачэнне, і дыястала, або расслабленне. У фазу дыясталы сэрца павінна расслабіцца і адпачыць. Павышаны дыясталічны ціск (у норме ён не павінен перавышаць 80 мм/рт/сл, 90 — гэта ўжо павышаныя лічбы) азначае, што замест расслаблення яно пастаянна працуе з нагрузкай. І безумоўна, такі стан патрабуе лячэння.

Пры павышаным дыясталічным ціску мы можам падазраваць парушэнне работы ныракаў, таму найперш трэба выключыць ныркавую паталогію. Таксама дыясталічны ціск можа быць павышаны і без прычын, а як генетычная асаблівасць: як існуе ізаляваная артэрыяльная сісталічная гіпертэнзія, гэтак жа ёсць і дыясталічная гіпертэнзія. І яна, у параўнанні з сісталічнай, больш складаная і цяжка паддаецца лячэнню.

Калі прычына высокага дыясталічнага ціску ў рабоце ныракаў (а гэта можа быць звужэнне ныркавых сасудаў, перанесеныя інфекцыі і іншае), то лячыць варта ныркавыя захворванні і падключыць прэпараты для зніжэння дыясталічнага ціску. Калі ж гэта ізаляваная артэрыяльная дыясталічная гіпертэнзія, то лечыцца менавіта яна. Тэрапія адрозніваецца, і таму, паўтарыся, важна звярнуцца да ўрача і высветліць, першасная гэта ці другасная артэрыяльная дысталічная гіпертэнзія.

Адзначу, што дыясталічны ціск можа быць павышаным не толькі ў пажылым, а ў любым узросце. Сёння кардыялагічная паталогія маладзее: змяніліся ўмовы жыцця, у нас шмат стрэсаў, мы вядзём маларухомы спосаб жыцця. Рэкамендацыі для прафілактыкі і сісталічнай, і дыясталічнай гіпертэнзіі аднолькавыя. Найперш гэта пастаянная фізічная нагрузка, якая дазваляе пазбегнуць траўматычных ускладненняў, садзейнічае развіццю калатэральнага кровазвароту (калі ў абыход праблемных участкаў развіваюцца дробныя крывяносныя сасуды) і павышае трываласць арганізма.

Чалавек

Пажылым рэкамендуюць шахматы і карты

Настольныя гульні карысныя для мозга

З узростам усе органы і сістэмы нашага арганізма, на жаль, пачынаюць функцыянаваць усё горш і горш. Гэта натуральны працэс, звязаны з механізмамі старэння, аднак у шэрагу выпадкаў ён спакойна паддаецца невялікай карэкцыі.

Часцяком найбольш моцна век б'е па цэнтральнай нервовай сістэме ў цэлым і функцыях памяці і запамінання ў прыватнасці (так званых кагнітыўных функцыях). Аднак жа шматлікіх праблем, звязаных з парушэннем кагнітыўных функцый, з узростам можна пазбегнуць дзякуючы настольным гульням. І гэта пацвярджае свежае даследаванне шатландскіх навукоўцаў.

Як паведамляецца на сайце Эдынбургскага ўніверсітэта, людзі, якія гуляюць у гульні, прычым не толькі ў шахматы, але і, напрыклад, у карты, больш схільныя таго, каб захаваць востры розум і памяць нават у глыбокай старасці. Даследаванне паказала, што тыя, хто рэгулярна бавіў час за настольнымі гульнямі, лепш спраўляліся з тэстамі на памяць і мысленне. Узрост удзельнікаў склаў 70 гадоў.

Псіхолагі Эдынбургскага ўніверсітэта дзевяць гадоў таму пратэставалі больш за 1000 чалавек ва ўзросце 70 гадоў на прадмет магчымасці запамінаць новую інфармацыю, прымаць рашэнні, а таксама замяралі хуткасць мыслення і агульныя паказчыкі разумовага здароўя. Затым удзельнікі паўтаралі адны і тыя ж разумовыя тэсты кожныя тры гады, пакуль пажылым людзям не споўнілася 79 гадоў. Удзельнікаў групы таксама спыталі, як часта яны гулялі ў настольныя гульні: карты, шахматы, лато — або разгадвалі крыжаванкі. Акрамя гэтага, каманда прыняла пад увагу вынікі тэста інтэлекту, які ўдзельнікі праходзілі, калі ім было па 11 гадоў. А яшчэ ўлічваліся і такія фактары ладу жыцця, як адукацыя, сацыяльна-эканамічны статус і ўзровень фізічнай актыўнасці.

Было выяўлена, што людзі, якія ў сталым узросце сталі часцей гуляць у настольныя гульні, мелі меншае зніжэнне навыкаў мыслення, асабліва ў дачыненні да функцый памяці і хуткасці рэакцыі на прыняцце рашэнняў. Даследчыкі кажуць, што атрыманыя вынікі дапамагаюць лепш зразумець, якія тыпы спосабу жыцця і паводзін могуць быць звязаныя з кагнітыўнымі функцыямі нашай цэнтральнай нервовай сістэмы.

Апошнія даныя дапаўняюць доказы таго, што больш актыўны спосаб жыцця можа быць звязаны з цэнтральнай нервовай сістэмай у старасці. Для тых, каму за 70, ёсць яшчэ адно важнае паведамленне. Яно заключаецца ў тым, што нават простыя настольныя гульні могуць быць прафілактыкай узроставага спаду мазгавых функцый і звязаных з гэтым захворванняў, падкрэсліваюць аўтары даследавання.

Нягледзячы на тое што ў цяперашні момант сувязь паміж настольнымі гульнямі і прафілактыкай узроставых паражэнняў цэнтральнай нервовай сістэмы здаецца відавочнай, у навукоўцаў наперадзе яшчэ шмат работы. Для пачатку ім трэба праверыць сваю гіпотэзу на большай колькасці людзей з розных сацыяльных груп, а таксама высветліць, якія з настольных гульняў з'яўляюцца больш «магутнымі» прафілактычнымі сродкамі.

Акрамя гэтага, у планах шатландскіх навукоўцаў маецца распрацоўка рэкамендацый і правілаў, згодна з якімі можна будзе праводзіць прафілактыку ўзроставых змяненняў пры дапамозе настольных гульняў. Але гэта будзе магчыма толькі ў тым выпадку, калі названыя тэзісы знойдуць сваё пацвярджэнне ў шырокамаштабным даследаванні.

А вы ведалі?

Што такое «парыжскі сіндром»

Штогод псіхічнае засмучэнне з рамантычнай назвай «парыжскі сіндром» здараецца ў сярэднім у 20 японскіх турыстаў, якія не ў стане суаднесці сваё ўяўленне пра Парыж з рэальнасцю.

Рэч у тым, што японцы па еўрапейскіх мерках гіперуспрымальныя, а Парыж у іх уяўленні (дзякуй рэкламе) — горад мары, дзе ўсе жанчыны — прыгожыя, а ўсе мужчыны — галантныя. І калі яны ў гэтую сваю «мару» сапраўды трапляюць, яна здаецца ім начным кашмарам — непрыветлівыя афіцыянты, абыякавыя прадаўшчыцы, нахабныя пакаёўкі. Каб прыйсці ў норму, прыблізна траціне пацярпелых дастаткова парачкі сеансаў псіхатэрапіі, але большасці даводзіцца лячыцца даволі доўга.

Як камары забілі 52 000 000 000 чалавек

Амаль палова з усіх людзей, якія калі-небудзь жылі на Зямлі, — звыш 50 мільярдаў — памерла ад хвароб, пераносчыкамі якіх з'яўляюцца камары, такіх як воспа, адзёр, малярыя, жоўтая ліхаманка, ліхаманка Дэнге і г. д. Камары пераносяць усё што толькі можна: бактэрыі, вірусы, паразітаў. Таксама іх укусы могуць выклікаць алергічныя рэакцыі рознай ступені цяжкасці аж да анафілактычнага шоку.

ЗАКАПАЙЦЕ МЯНЕ Ў ЛЕСЕ,

або Што такое «зялёныя» пахаванні

Індустрыя экалагічна чыстых пахаванняў набірае абароты, але ўсё яшчэ сутыкаецца з сур'ёзнымі праблемамі.

Наведвальнікі мемарыяльнага запаведніка «Белы арол» на поўдні штата Вашынгтон не знойдуць шэрагу надмагілляў, дагледжаных газонаў ці сцяжынак, якія вядуць да месца апошняга спачынку блізкага чалавека. Замест гэтага яны гуляюць па дубовым лесе плошчай 20 гектараў. Целы тут змяшчаюць у неглыбокія магілы сярод дрэў, часта заварочваючы ў біяраскладальныя матэрыялы, дазваляючы разлагацца натуральным чынам і вяртаць пажыўныя рэчывы ў глебу. Такія пахаванні называюць «зялёнымі», і яны актыўна цяпер развіваюцца ў Еўропе, ЗША і Японіі. «Гэта быў вельмі павольны рост, але зараз мы бачым, што сітуацыя змяняецца ў спрыяльны бок», — кажа Браян Флаўэрс, каардынатар «зялёных пахаванняў» у штаце Вашынгтон.

На сённяшні дзень каля 200 пляцовак пад экапахаванні выдзелена ў Вялікабрытаніі. У ЗША іх 72. Тут сітуацыя ўскладняецца адмысловымі палажэннямі ў заканадаўстве розных штатаў. Некаторыя законы, напрыклад, патрабуюць асфальтаваных дарог, пракладзеных да ўчасткаў пахавання. Іншыя — агароджы вакол могілак. У некаторых штатах неабходна стварэнне спецыяльнай інфраструктуры для будучага абслугоўвання могілак, што, на думку прыхільнікаў «зялёных» пахаванняў, з'яўляецца цяжкім патрабаваннем для месцаў, якія мяркуецца пакінуць у іх натуральным стане і спакоі.

У многіх месцах мясцовыя чыноўнікі могуць не даваць «зялёным» могілкам дазволу на заніраванне ці прымаюць іншыя правілы для іх блакіравання. Напрыклад, у 2008 годзе камісары ў акрузе Мэйсан-Біб у штаце Джорджыя прынялі пастанову, якая патрабуе герметычных кантэйнераў для пахаванняў, пасля таго як мясцовыя жыхары паскардзіліся на прапанаваныя могілкі з «зялёным» пахаваннем.

Абаронцы такіх пахаванняў сцвярджаюць, што іх рух наспеў ужо даўно. Па звестках Зялёнага пахавальнага савета, які знаходзіцца ў Каліфорніі, на могілках у Злучаных Штатах штогод скідаюць у зямлю больш за 15 мільёнаў літраў вадкасці для бальзаміравання, 64 тысячы тон сталі, а таксама 1,6 мільёна тон бетону.

Насельніцтва таксама мяняе свае прыярытэты. Паводле справаздачы Нацыянальнай асацыяцыі дырэктараў пахавальных службаў, больш за палову памерлых у ЗША на сённяшні дзень крэміруюць, тады як у 1960-х гадах гэты паказчык складаў усяго 4 %. На думку амерыканцаў, такі спосаб менш шкодзіць навакольнаму асяроддзю, але гэта не зусім так. Для крэмацыі патрабуецца награванне печы да 1000 градусаў Цэльсія на працягу дзвюх гадзін. Выкіды шкодных рэчываў (дыяксін, двухвокіс серы і вуглякіслы газ) у атмасферу пры гэтым прыблізна адпавядаюць выкідам аўтамабіля, які праехаў 800 кіламетраў.

Цяпер, паводле звестак асацыяцыі дырэктараў пахавальных службаў, амаль 52 % амерыканцаў праявілі цікавасць да варыянтаў такога натуральнага пахавання. «Большасць людзей ведае, што гэта такое. Яны проста не ведаюць, як гэта ажыццявіць», — кажа Лі Вэбстэр, член Зялёнага пахавальнага савета.

Сярод прычын, па якіх «зялёныя» пахаванні маюць добрыя перспектывы развіцця, — не толькі іх экалагічная чысціня, але і адносна невысокі кошт. Звычайныя пахаванні ў ЗША каштуюць больш за 8000 долараў яшчэ да куплі ўчастка на могілках, сам участак каштуе яшчэ ад тысячы да чатырох. «Зялёныя» пахаванні абыдуцца значна танней — ад 2 да 4,5 тысячы долараў.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Спытайце пра радзіннае

Што рабіць з фотаздымкам памерлага?

«Я страціла сына. Пасля пахавання на магіле паставілі яго вялікі фотаздымак. Праз год мы паставілі помнік, на якім мастак выгравіраваў партрэт. Куды дзець фотаздымак? Спачатку хацела забраць дадому, але людзі казалі, што з могілак дадому забіраць нічога нельга. Як быць?» — задае пытанне Марыя Іванаўна са Стоўбцаў.

На першы погляд, пытанне даволі простае, аднак калі згадаць шэраг сітуацый, звязаных з «матэрыялізацыяй» слядоў памерлага ў першы паслясмяротны год, то вырысоўваецца складаны вузел узаемасувязяў.

Звернемся да традыцыі. Толькі што памерлага чалавека памылі і пераапранулі, каб у «той» свет ён пайшоў «ва ўсім новым». А для таго, каб здань (або душа) памерлага не адбілася (не «сфатаграфавалася»!) побач з постацямі жывых, у хаце люстэрка тут жа пераварочвалі да сцяны. Пазней паліраваную мэблю і ўсё шкляное пачалі экраніраваць — закрываць тканінай белага колеру. Прычым гэта правіла характэрна для ўсіх рэгіёнаў Беларусі.

Непаразуменнем з'яўляецца сучасная мода фатаграфаваць памерлага і запісваць на відэа абрад пахавання. Тут, калі хочаце, разгортваецца адваротны ход дзеянняў: памерлага «вяртаюць» назад у хату — зону жывых. Усё перамяшалася ў нашым жыцці: на могілкі прыносім жывыя кветкі, а свой дом аздабляем нежывымі букетамі, вянкамі.

На жаль, не хочам мы прыслухоўвацца да слоў, якімі продкі прамаркіравалі наша наваколле і акрэслілі характар узаемаадносін з ім. Месца пахавання памерлых называюць: магіла (прыгадайце сённяшні слэнг: абяцанне захаваць тайну — «магіла») або клады, кладаўё (*руск.* кладбище) — г. зн. клад, які не даваўся ў рукі абы-каму. Надзвычай празрыстую семантыку мае рускае слова «погост» — месца, куды можна схадзіць у госці (пагасціць) да памерлых. А калі вярталіся дадому пасля такога «гасцявання», то перад парогам (!) абавязкова мылі рукі.

Давайце расстаўляць ўсё па сваіх месцах, зразумела, з улікам сучасных навацый. Калі вы вырашылі паставіць побач з памерлым партрэт, зроблены з яго прыжыццёвага фотаздымка, то зрабіце яго толькі ў адным экзэмпляры. Далей гэты партрэт разам з вянкамі і іншымі пахавальнымі атрыбутамі занясіце на магілу. Роўна праз год будзе ўзведзены помнік, а фотаздымак, як і драўляны крыж, неабходна знішчыць, г. зн. назаўсёды пакінуць на магіле (або спаліць, або пахаваць (!) на глыбіні 30—40 см). Не пакідайце фота, перавязанае чорнай стужкай, у хаце. Зразумейце адно: калі мы на працягу года ладзім памінальныя сталы ў адпаведнасці з універсальным рытмам 0 — 3 — 9 — 40 — 1 год, гэта значыць, што з душой памерлага ў гэтыя ж дні нешта адбываецца. Калі сказаць адным словам, то душа знаходзіцца на шляху пераходу з зямнога жыцця ў нябеснае існаванне. Але ж фота чалавека — гэта яго двайнік, які працягвае сваё зямное існаванне. І мы перашкаджаем душы памерлага знайсці вечны спакой. Добрая парада: на працягу першага пасля смерці года ўсе прыжыццёвыя фотаздымкі памерлага сабраць і схаваць у асобнае месца. Лепш не фатаграфаваць памерлага ў труне і не захоўваць такія фотаздымкі дома. Фатаграфіі робяць дзеля таго, каб зафіксаваць самае лепшае і прыемнае з нашага жыцця. А хто будзе пераглядаць фотаздымкі з пахавання?

Дыялог з продкамі быў пастаянным каналам зносін, у тым ліку і абрадавым. Аднак ён патрабаваў прытрымлівацца стагоддзямі выпрацаванага рэгламенту. Калі вы ставіцеся да продкаў з павагай, шанаваннем, разуменнем, то і «свет» памерлых ніколі не пакрыўдзіць вас.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні на паштовы ці электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

ПЕРШЫ СНЕГ — НАЗАЎЖДЫ

Было гэта амаль семсот гадоў таму. Вялікі князь Гедымін загадаў пабудаваць замак, ды такі, каб на шляху ворагаў неадольнай сцяной стаяў, надзейна бараніў і гаспадароў, і просты люд. Больш за два дзясяткі тысяч кубаметраў бутавага каменя ды паўтара мільёна цаглін паклалі майстры ў магутныя сцены і вежы бліз балоцістых берагоў дзвюх рачулак. Праз некалькі гадоў, калі ўсё было гатова, заўважылі людзі, што найбольш прыгожа выглядае замак у дзень першага снегу. У гэты дзень прырода дадае пяшчотную белую фарбу да суровага колеру шэрых камянёў і распаленага чырвонага колеру цаглін.

Такой прыгажосцю можна любавацца і ў наш час. Зведаўшы розных уладальнікаў, перажыўшы разбурэнні і знявагу, адноўлены замак зноў цешыць вочы, а вакол яго красуецца старажытны горад Ліда. Сёлета першы снег упершыню лёг на плечы князю Гедыміну — помніку, які ўсталявалі тут тры месяцы таму.

Няхай не пакрыўдзяцца жыхары Ліды, што толькі некалькімі фотаздымкамі паказваю я прышэсце першага снегу — у горадзе вы ўбачыце шмат прыгожых месцаў у любы дзень. Але ж у першы снег...

Я не веру, што снег растае і знікае бясследна,
Як знікаюць пустыні, азёры, лясы, гарады.
Могуць знікнуць калісьці раптоўна ўсе зоркі сусвету,
Але першага снегу сляды — ва ўспамінах заўжды.

Снег даўнейшых часоў бачу я каля замкавай вежы,
Гедымінавы коні капыцяць асцюжаны дол,
Пралятаюць чароды стагоддзяў і зноў першаснежыць,
І прышэсця зімы стары замак чакае ізноў...

Ля аснежанай брамы спачылі начныя дазоры,
Першы снег — нібы першы акорд у зімовы мінор.
Першы снег, як заўжды, дорыць гораду срэбныя ўборы
І няўрымслівым птахам на зялёны ляціць святлафор.

Яўген ПЯСЕЦКІ, (здымкі аўтара)

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«В НОВЫЙ ГОД НА ПОЛНОЙ СКОРОСТИ»

Настоящие правила проведения рекламной игры «В новый год на полной скорости» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 и определяют порядок проведения рекламной игры «В новый год на полной скорости» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Игровой Код – это пятнадцатизначный номер, который присваивается участнику по порядку, дате и времени покупки на любой автомобильной заправочной станции ИООО «Газпромнефть-Белнефтепродукт» (далее – АЗС) и печатается на кассовом чеке при соблюдении п.10.1. настоящих Правил.

Номер Участника – это номер Участника розыгрыша призов, который присваивается за каждый полученный Игровой Код по порядку, по дате и времени получения Участником Игрового Кода, если участник уже прошел регистрацию на Интернет-сайте либо по дате и времени регистрации на Интернет-сайте.

Розыгрыш – розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

Участник – физическое лицо, которое приобрело один из Товаров, участвующих в игре, и выполнило требования, необходимые для участия в Рекламной игре.

Карта Лояльности – бесконтактная радиочастотная пластиковая карта, выпущенная Заинтересованным лицом, имеющая персональный идентификационный номер и содержащая сведения об участнике программы лояльности «Разам з намі», которая определяет указанное лицо как участника данной программы.

Кассовый (товарный) чек – документ, подтверждающий факт совершения покупки, который должен содержать сведения о номере документа, наименование продавца (номер, АЗС, где была совершена покупка), дату продажи, наименование, количество и цену товара, итоговую сумму покупки.

Персональные данные – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать на Интернет-сайте, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно),
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно);
- почтовый адрес, включая индекс (обязательно);
- номер Карты Лояльности (обязательно).

Товар – нефтепродукты и сопутствующие товары за исключением табачных изделий, алкогольных напитков, пива и слабоалкогольных напитков.

Товар-активатор – сопутствующие товары, реализуемые в сети АЗС «Газпромнефть». Присутствие в чеке как минимум одного из данных товаров обязательно.

Интернет-сайт – www.promo-gpn.by.

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф.21, 220073, УНП 191728827.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Газпромнефть-Белнефтепродукт», Республика Беларусь, 220050 г. Минск, ул. Мясникова, д. 70, 4-й этаж, пом. 24, УНП 191118996.

3. Участники Рекламной игры.

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет (далее по тексту – Участники).

Участниками игры являются держатели Карт Лояльности, приобретенных как до начала Игры, так и в период ее проведения.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

4. Наименование Рекламной игры: «В новый год на полной скорости».

5. Территория проведения Рекламной игры: АЗС, расположенные на территории Республики Беларусь.

6. Дата начала Рекламной игры: 19 декабря 2019 года.

7. Дата окончания Рекламной игры: 19 марта 2020 года.

8. Наименование товаров или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:

Игра проводится в целях стимулирования продаж Товаров, реализуемых на АЗС, с условием обязательной покупки как минимум одного Товара-активатора из следующих наименований:

№	Наименование
1	Жид/ст ГПН -55 концентрат 1 л
2	Жид/ст ГПН БЗБ -20 канистра 4 л
3	Напиток G-Drive эн газ ж/б 0,45 л
4	Напиток G-Drive эн газ ПЭТ 0,5 л
5	Напиток G-Drive эн ж/б 0,25 л
6	Кофе Drive Cafe Американо 0,2 л
7	Кофе Drive Cafe Американо XL 0,3 л
8	Кофе Drive Cafe Капучино 0,2 л
9	Кофе Drive Cafe Капучино Grand 0,4 л
10	Кофе Drive Cafe Капучино Strong 0,2 л
11	Кофе Drive Cafe Капучино XL 0,3 л
12	Кофе Drive Cafe Латте 0,2 л
13	Кофе Drive Cafe Латте Grand 0,4 л
14	Кофе Drive Cafe Латте XL 0,3 л
15	Кофе Drive Cafe Моккачино 0,2 л
16	Кофе Drive Cafe Моккачино Grand 0,4 л
17	Кофе Drive Cafe Моккачино XL 0,3 л
18	Кофе Drive Cafe Эспрессо 50 мл
19	Кофе Drive Cafe Эспрессо XL 0,1 л
20	Кофе G-Drive 60 мл
21	Кофе G-Drive XL 0,12 л
22	Напиток Drive Cafe Горячий шоколад 0,2 л
23	Напиток Drive Cafe Горячий шоколад XL
24	Напиток Drive Cafe Горячий шоколад Grand 0,4 л

9. Призовой фонд Рекламной игры.

